Новы Час | 27 верасня 2019 | № 36 (647) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №9

Літаратурная Беларусь

Выпуск №9 (157)
(верасень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Якія мы?

Або ўся праўда пра нашу нацыянальную ідэю



Алесь МІКУС

У суседзяў менш-больш складваецца з нацыянальнай ідэяй, а ў нас з гэтым так цяжка, што рукі апускаем.

Нацыянальная ідэя… Зацягалі гэты выраз. Дзяржаўная ідэалогія, нацыянальная ідэя… Ну праўда ж, зацягалі, да дзіраў ужо.

Груваткія фармулёўкі, а-ля падручнікі, нічога не дадуць, калі няма яснасці ў галовах. Нацыянальная ідэя, якую ўсе нібыта шукаюць, гэта пра дзве рэчы, і гэтыя рэчы адрозныя: адкуль прыйшлі і куды ідзем.

Але «адкуль прыйшлі» — гэта не пра падручнік з падрабязным выкладам «усяго, што было». Гэта звычайна пра адну ідэю, што выдзелена з усяго масіву дадзеных з мінуўшчыны. Ці нават хутчэй вобраз, нешматслоўны наратыў, які можна нібы казку расказаць малым слухачам у дзіцячым садку. Візія мінуўшчыны — яна аблігаторна цэльная, не фрагментарная.

Такім чынам, можна адкласці ў далёкія архівы ўсе выдадзеныя за мінулае дваццацігоддзе «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці», бо яны — не пра візію мінуўшчыны, гэта расповеды пра аскепкі, як пры ваенным раненні, у галовах тых, хто стварыў яе канцэпцыйна.

Зірнем на суседзяў. Толькі з першага боку ў расійцаў ідэі праваслаўя, Расійскай імперыі і Сталіна несумяшчальныя. Шмат хто ж здзіўляецца. Усё там сумяшчальна, толькі выдзеліце там ідэю, што іх яднае. Пашырэнне, інвазія навонкі, місіянерства, захоп. Вось і ўся іх цяперашняя ідэя. Там нават не індаеўрапейская ідэя імперыі (шматстайнасць у сукупнасці, як жывы свет паганскіх сілаў), бо русіфікуюць і ўніфікуюць, а таксама пагарджаюць адрознасцю.

У найменш колькасных з нашых суседзяў, латышоў, візія мінуўшчыны такая: калісь быў пляменны рай, прыйшлі немцы, паняволілі, а потым расійцы, замяніўшы немцаў, прыбрылі замінаць латышам жыць у шчасці. Латышы не мудруюць, а працягваюць тую ж 800-гадовую лінію: працягваюць вызваляцца ад захопніка, і ён зноў унутраны.

У літоўцаў пункт адліку таксама ў мінуўшчыне — гэта ранняя Літва балцкіх князёў, якія ў нейкі момант выцягнулі дзяржаву быць паміж двух мораў. Але затым пайшоў адкат, і тэрытарыяльна, і рэлігійна, і моўна. І ўвогуле, усё пазнейшае — непазбежны рэгрэс. Літоўцы маюць трохі раздзёру ўнутры, ад усведамлення прагалу паміж «Вітаўтавай Літвой» і цяперашняй тэрыторыяй, якую да таго ж «падгрызаюць» польскамоўныя на Віленшчыне і рускамоўныя ў Клайпедзе.

Ад той ранняй Літвы застаюцца навейшыя паганскія алтары па ўсёй краіне, але для цяперашняга свету гэта не надзённа. Далучыцца да вялікіх — доля маленькіх, якія разумеюць, што яны маленькія.



Калаж www.pixabay.com

«Нацыянальную ідэю» цяпер не надта любяць, бо пад ёй разумеюць асобны шлях. Усе шляхі сёння менш-больш аднолькавыя, для сярэдніх і меншых суб'ектаў

Украінцы — як і літоўцы — перажываюць свой «раздзёр», але ўжо паміж «казакамі і свінапасамі». Прычым «свінапас» — панятак не такі і дэманічны, бо гэта ўсяго толькі «Пузата хата», «баба-галава», «усё ў сям'ю», «Вялікая і Малая Харужаўка» ва ўладных кабінетах (памяцце часоў Юшчанкі, — ды і не яго аднаго, — які да непрыстойнага насяліў уладу землякамі). А казакі — гэта вайна на Усходзе Украіны, добраахвотніцкія батальёны, праспект Бандэры. І тое, і тое («казакі» і «свінапасы») развілося і мае месца сёння. Трохі сутыкаецца міжсобку, але дае досыць трапнае ўяўленне пра ўкраінцаў. Ідэя пра казакоў, дарэчы, сканструяваная, яна не з народу — з народу якраз пчолы, вішнёвы садочак, варэнікі, боршч і акруглая чарнабровая Галя…

Але гэта збольшага пра мінуўшчыну. Гэта прыклады, на якія чалавек арыентуецца. Падобны прыклад можа быць не сучасным, але ён шмат што канстытуе. Ён пастаянна прысутны трохі глыбей за свядомасць, і з ім звяраюцца.

Візія будучыні сёння немудрагелістая. Варыяцый асаблівa няма. Прагрэс, тэхналогіі, патрэбы жывата, пачуць голас кожнага, усякая драбнічка мае анталагічнае права быць. Варыяцый няшмат. (Дух, заваёвы, правы народаў, іерархічнасць — усё гэта неактуальна). Хіба што расійцы могуць дазволіць сабе мець драўляную прыбіральню на вуліцы і ганарыцца высокатэхналагічнай зброяй (дарэчы, гэта таксама «раздзёр»), але тое з-за манструознай тэрыторыі, гэта выключэнне. «Няхай свет лясне, затое мы патрапім у рай, а яны не».

Окей, гугл, а што мы? Ізноў жа, нельга ўвесь час утрымліваць пад увагай полацкіх (ці хутчэй варажскіх) князёў, Гедзіміна ў Лідзе, цудоўнага акупацыйнага мінскага губернатара Захарава, БССРыю, подзвіг народа, рэспубліку — зборачны цэх. Трэба штосьць адно. А ўсё іншае мусіць цярпець (it must suffer) і быць выкрасленым ці, прынамсі, адсунутым далей з-пад вока.

«Нацыянальную ідэю» цяпер не надта любяць, бо пад ёй разумеюць асобны шлях. Усе шляхі сёння менш-больш аднолькавыя, для сярэдніх і меншых суб'ектаў. Але візія будучыні — не адзіны складнік націдэі, а адзін з двух. Другі ж — гэта прыклад з мінуўшчыны, які мае аб'ядноўчы патэнцыял.

Селяніна мы збэсцілі псеўда-фальклорнымі ўсмешкамі «Харошак», хоць багушэвічы пачыналі з «Сялянкі». Арыстакратаў пастралялі як Скірмунта ў Парэччы, і панасміхаліся. Літва не наша (дакладней, наша, але толькі «пасяродцы», калі ўжо не балцка-літоўская, але яшчэ не польская-рэчпаспалітаўская). Да Русі мы таксама ўзбочныя, бо цэнтры былі звонку — Кіеў і Масква. «Правільная» Радаўніца ў нас толькі на ўсходзе, а ў астатнім мы і зусім маларэлігійныя. Савецкі Саюз стваралі не мы, мы там толькі «трудзілі» сябе як заведзеныя. Нашчадкамі крэваў-святароў таксама быць не схацелі…

Вось гэты другі складнік у нацыянальнай ідэі (каторы не пра будучыню, а пра мінуўшчыну) — гэта шмат у чым адказ на пытанне «Якія мы?». Жывучы тут у сябе, у даволі закрытым усё ж грамадстве (прынамсі, ментальна), нам гэта не дужа рупіць. А варта аказацца сярод замежнікаў — і вох як даецца ў знакі, што мы самі не дужа ведаем, як сябе падаваць (апроч як кліенты ці найміты). З кім асацыяваць, бо не вывуджваецца з глыбіняў падсвядомасці мадэль, з якой роднімся.

Дык якія мы? Можа, ніякія? Годзе ківаць на Абдзіраловіча.

Што пэўна, дык гэта тое, што мы выканаўцы добрыя. Дык гэта якраз ад адсутнасці зместу, вось і набіваюць у мяшок са скуры і шкілету ўсякай саломы, якой каму захочацца. Мы можам быць усякімі, мы запоўнімся тым, чым вам заждаецца, і, тым не менш, мы жывыя, хоць у гэта і цяжка паверыць…

naviny.by

«Свечка мне сведчыць»

Нядаўна ў «Кнігазборы» (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў) пабачыла свет адметнае чарговае выданне — кніга вершаў берасцейскай паэтэсы Святланы Воронік «Пацеркі даверу». Зацікавіла, выклікала патрэбу выказацца.

Увогуле, падумаў, рызыкую. З аднаго боку — кніга выклікае цікавасць, а з другога — падумалася, ці буду аднязначна слушным у сваім поглядзе. З аднаго боку — кніга «Пацеркі даверу» вартая ўвагі, а з другога — зусім непадобная на іншыя вершаваныя зборнікі, створаныя ў звыклай для нас традыцыйнай сілабатанічнай сістэме вершаскладання. Да таго ж пазбаўленая, у прыватнасці, добра знаёмай нам традыцыйнай вершаванай паэтыкі, узнёслага пафасу. Пра свае лаканічныя, графічна сціслыя вершы сама аўтар гаворыць: «Маўчанню верыць слова», «Зразумееш маё маўчанне, яно адгукнецца словам». Ці вось радкі:

***

Мірыяды пяшчотных слоў.
Быццам знічкі ў жніўні.
Загадаю жаданні слоў.

***

Вершы — лісце на дрэве...
Ліст — дрэва верш...

***

Раство Хрыстовае
агучвае надзеі.
Без дзеяў
Слоў замала.
Мама...
Увасхрашаем сілу слоў
без слоў.

Падзяліўшыся, па тэлефоне, радаснай навіной: «У мяне выйшла кніга», спадарыня Святлана дадала ў такім духу, што, маўляў, свае карацелькі не столькі піша, колькі выдыхае. Пэўна, так яно і ёсць. Пра гэта кажа і ў сваіх мініяцюрах.

***

Як многа...
Уздых гаворыць.

***

Развітальнае слова тваё — уздых.
Не надыхацца.

Словам, вершы — дыханне. І яшчэ — вершы — сны. Самыя што ні на ёсць такія.

***

Дзень — кароткі, як ноч, калі спіцца.
Сны Тваё сняцца мне...
У разбураных словаўспамінах...

***

Цесна ў снах.
Хачу вырвацца ў сон.
Прачынаюся.
Сніцца, што сплю...

Вершы — дыханне, вершы — сны, вершы — чарадзейства і вершы... Чытаем:

***

У Кастровічах — цішыня...
вершаць вершы
мой боль
і — любоў мая...

Кастровічы — родная вёска паэткі. Што ў некалькіх кіламетрах ад Слоніма, апетага натхнёна Алегам Лойкам. Гэтак жа апявае і Святлана Варонік.

***

Дарога ў маё маленства...
Аерам пахнуць далоні...
Успамінаецца Слонім...
І слова ў душы расце...

***

У Слоніме —
як фея —
завея...
Неспадзеўнай гэтай заслоне
веру ў Слоніме
як ніколі...
Белай скрухі маёй зіма...

***

Радасць мая харошая,
позняя, адвітальная,
снішся мне...
І я — ведаю...

Боль і любоў, глыбока нацыянальныя пачуцці, гучаць у тым жа лапідарным стылі і ў вершах пра нашае гістарычнае мінулае, пра тое, як «ішоў з-пад Купран Багушэвіч», як сумуе па далёкай Радзіме душа Дамейкі («Не маўчы, акіян, Ціхі... Недзе ж Нёмана кропля ў табе...»), як «вярнуўся ў нашу вёску Карусь Каганец».

З самым непасрэдным разуменнем успрымаем выснову аўтаркі:

***

Я — духі продкаў.
І я — Радзіма.
Ты — у мінулым.
І мы — яшчэ будзем!

Нельга не прывесці ў гэтай сувязі, у сувязі з ідэйна-патрыятычнай тэмай, двухрадкоўе, якім завяршаецца кніга:

***

На ганку роднай хаты...
Як на вяршыні....

Кропка над «і». Лепш не скажаш, больш выразнай метафары не прамовіш.

Яшчэ некалькі слоў, накшталт неабходнага дадатку. Адзін з ключавых матываў зборніка — матыў самоты (адзіноты). «Прашу ў мора адзіноты хоць кроплю...»; «Такая самотная ад цябе дарога, самотай вяртаюся ў свой дом»; «Ты адзіноты маёй пяшчота» і інш. Гэта ў вобразна-мастацкім плане. Ды ў рэальным Святлана Варонік як творца, як аўтар — зусім не самотніца, не інтравертка. У дачыненні да шэрагу сваіх вершаў яна называе імёны Уладзіміра Калесніка, Васіля Быкава, Ніны Мацяш, Данута Бічэль, Алега Лойкі, Міхася Стральцова, Ліны Кастэнкі, Галіны Скарыны. Спасылаецца на іх творчасць. Асаблівым пачуццём прасякнутыя творы, прысвечаныя Ніне Мацяш: «Восень прыйшла», «У Белаазёрску ёсць царква» і адзіны ў кнізе шматрадковы твор «Снежаньская ружа». Гэта, апроч іншага, абумоўлена і тым, што аўтарка кнігі надзвычай чула ставілася да Ніны Мацяш і ў творчым і ў чалавечым плане.

Існуе выслоўе: таленавіты чалавек — ва ўсім таленавіты. Гэта якраз наш выпадак. Кастравіцкая дзяўчына паспяхова скончыла філалагічны факультэт Брэсцкага педінстытута. Шмат гадоў працуе на такім жа, філалагічным, факультэце Брэсцкага ўніверсітэта. Карыстаецца, канешне ж, павагай, аўтарытэтам. І не толькі як выкладчык, але і як кіраўнік Адукацыйна-асветнага цэнтра імя Ул. Калесніка. Перакладае з польскай і ўкраінскай моваў, піша музыку на вершы беларускіх (і на свае ўласныя) і ўкраінскіх паэтаў. Іграе. На гітары і гармоніку. Мае аж тры гармонікі! Уявіце сабе... Ну і вось, — як бачым, пра што ішла размова, — Святлана Варонік з'яўляецца аўтарам своеасаблівай паэтычнай кнігі «Пацеркі даверу».

Паколькі гаварылася пра музычны талент паэтэсы, дадам яшчэ ў заключэнне колькі слоў, як ён канкрэтна адбіваецца на гукапісе, гукавай інструментоўцы асобных вершаў. Напрыклад:

***

Свечка мне сведчыць
пра вечнасць
Светла.

***

Ліпень ліпіць дажджамі.
Льюцца ліпнёвыя ночы.
І я пра цябе, за вочы,
усмак гавару-гару.

Сардэчна жадаю Святлане Варонік і надалей паспяхова крочыць «шляхам, якім вярстуе любасць», у музыкальнай і паэтычнай творчасці.

1.08.2019 г.

P.S. *Гаворачы пра адметную сціслась, лаканізм формы вершаў Святланы Варонік, я чамусьці прамінуў вось гэты верш:*

***

У пыле — сляпыя дажджынкі.

Сведчу, ёсць у кнізе, на дваццаць сёмай старонцы, такі верш — радок. Ці не перастараліся тут аўтар з рэдактарам? Ці не паказным з'яўляецца такі вось лаканізм? Не, рэч не ў гэтым. Рэч у тым, што паэтэса надзвычай пранікнёна і паслядоўна, з верша ў верш, падае адметныя з'явы нашай, беларускай прыроды. Зусім невыпадковыя ў вершы-радку само параўнанне і гэтыя вось «сляпыя дажджынкі». Чытаем-гартаем «Пацеркі даверу»: «у сонны горад дождж прыйшоў...»; «Крынічная кропля ці дажджынка?..»; «Дождж слугуе майму настрою»; «І ты са мною, і дождж сляпы...»; «І дажджынкі ўсе — Тваё...» і г.д. Ну і вось яшчэ адно асэнсаванае адценне той жа лексемы, гэты самы сціслы і гранічна дакладны твор кнігі «Пацеркі даверу».

Анатоль Вярцінскі

Родныя здані

(Водгук на раман Алеся Аркуша «Сядзіба»; Полацак. Выдавецкая ініцыятыва «Полацкае ляда»)

Кніг, якія хацелася б чытаць, на белым свеце багата. А ў якіх хацелася б пажыць, прычым ва ўмовах сучаснай Беларусі, не адлятаючы за цёплае мора ці ў міфічную будучыню на іншую планету, амаль няма.

Раман Алеся Аркуша «Сядзіба» менавіта такая кніга. Побыт суседнічае з містыкай, філасофскія развагі — з драматычнымі падзеямі, але пры гэтым няма пакручастай напружанасці ў сказах і словах, твор чытаецца лёгка, а чытач пад час чытва адчувае сябе хораша і нязмушана.

Месца дзеяння — прыватная гарадская сядзіба ў старажытным Полацку, набытая гаспадарамі разам з сабакам. Падворак стаіць на беразе Дзвіны ў чароўным месцы, але, як высвятляецца, гэты лапік зямлі хавае нейкую трагічную таямніцу.

...Мяне не палохалі ані дзіўнае мармытанне з гарышча, ані неспадзяваныя сляды босых ног на расе, нават адчуванне прысутнасці істотаў паралельнага свету прыймалася як дадзенае. Здаецца — каб пабачыла, што з туману выйшаў дзед у белым, дык павіталася б. Бо гісторыі пра вядзьмачыя чары мне змалку не ў навіну.

Але адна справа дзівіцца з выбрыкаў нячысцікаў ці зданяў у якасці госця ці назіральніка. Іншая — мець ва ўласнасці сядзібу, на якой няма ладу ні з агародам, ні з ацяпленнем, самі сабою загараюцца свечкі, бразгочуць кілішкі, у стосе старых часопісаў знаходзяцца нейкія дзіўныя дзённікавыя запісы былога гаспадара, а колішняя гаспадыня прамаўляе: «Не зазналі тут шчасця»...

На працягу рамана ягоныя героі спрабуюць зразумець сутнасць анамальных з'яў, дацьім рады. Але гэтыя пошукі абароны ад уплыву істотаў паралельнага свету не замінаюць жыць напоўніцу: парадчыць гаспадарку, назіраць за палётам кірляў над Дзвіною, у думках вяртацца ў дзяцінства, дзе ад цябе нічога не засталося, прымаць гасцей, разам з сябрам, мясцовым літаратарам Кастанам Навадворскім, абмяркоўваць сюжэт ягонага гістарычнага дэтэктыву, прысвечанага славутаму кубку Стэфана Баторыя, разважаць пра таямніцы полацкай гісторыі.

З самага пачатку чытання ў мяне не было сумневу: прывіды наўрад ці здольныя сур'ёзна нашкодзіць гаспадарам сядзібы. Бо ўменне герояў шанаваць і трымацца свайго, прычым рабіць гэта не напружваючыся, па-дзіцячы радасна — найлепшая абарона ад нячысцікаў. Узняцца ўвечары на дах шматпавярховіка, каб зірнуць на родны горад, лежачы ў густой траве пад сакатанне конікаў гаманіць пра перавагі людскога жыцця на азёрнай выспе, задумацца, якая рыбіна і птушка — тваё ўлюбёныя, — ці кожнаму дарсламу такое прыйдзе ў галаву?

Рачныя хвалі, расліны, жывёлы, птушкі, колеры вады і неба адыгрываюць у рамане даволі значную ролю, хаця доўгія апісанні прыроды тут адсутнічаюць. Краявідам няма патрэбы адлюстроўваць настрой і памкненні людзей, бо рака і наваколле з'яўляюцца цалкам самастойнымі і ці не галоўнымі героямі.

«Сядзіба» — містычны твор. Але ягоная містычнасць зусім не такая, як у падлеткавых прыгодніцкіх аповесцях часоў СССР, дзе піянеры паўсюль палююць на шпіёнаў, а стражытныя скарбы пад кожным пнём закапаныя.

Яна існуе ў звыклых рэчах, яна сузіральная, падобная да цяпельца ў грубцы, выклікае давер і ўражвае знітаванасцю са штодзённасцю. Нават у дзіцячых ўяўленні мінуўшчыны пра начныя шпацыры бронзавага Леніна па пасёлку верыш, узгадаўшы, як некалі школьнікі з-пад Бабруйска казалі амаль тое самае пра тамтэйшы помнік героям-пераможцам.

Аўтар рамана не раскрывае да канца ўсіх таямніцаў, героі не маюць жадання давядацца пра ўсё да апошняй дробязі, бо немагчыма гэта ані ў кнізе, ані ў жыцці!

Пры ўсёй сваёй захапляльнасці і вобразнасці мовы «Сядзіба» падалася мне ўсё ж такі творам для сталых чытачоў з жыццёвым досведам. Вядома, падлеткі ды дарослыя, што не бачаць розніцы між легкадумнасцю і пазітывам, могуць таксама зацікавіцца, але сумняюся, што здолеюць зразумець.


Сюжэтныя лініі «Сядзібы» не перакрыжоўваюцца і не сыходзяцца ў адно, так і застаючыся паралельнымі. Іх міжсобку лучыць хіба месца дзеяння — Полацкая зямля. Але лучыць настолькі моцна, што мажлівасці ўявіць іх у якасці асобных твораў не выпадае. Расповеды пра цяперашчыну і мінуўшчыну, людзей і зданяў, дэтэктыў і дзіцячыя ўспаміны кожныя па-свойму пацвярджаюць думкі, выказаныя героямі рамана, пра тое, што эпохі змяняюцца, усё перайначваецца — а людзі застаюцца такімі ж самымі.

...Перагарнуўшы апошнюю старонку «Сядзібы», я ўрэшце даўмелася (хаця мо і не да канца, бо далёка ад вялікай вады гадавалася), чаму ля дома абавязкова мусіць быць рака — каб яе аксамітныя хвалі маглі вярнуць зданям тое, што людзям ужо не належыць.

Таццяна Барысік

Прадчуванні

Васіль ЖУКОВІЧ



Фота www.lit-bel.org

1

Сінявокая, з тоўстаю пшанічнаю касою дзяўчына вырасла ў прыгожым старажытным беларускім гарадку, у інтэлігентнай сям'і, дзе прыкметнае месца займалі музыка і песні. Бацька, армейскі доктар, віртуозна граў на акардэоне, маці, музыказнаўца, і малодшая сястра добра спявалі, кожная акампануючы сабе на фартэпіяна. Рэгіна, так звалі дзяўчыну, не валодала дасканала ніякім музычным інструментам, ды захаплялася эстрадаю. Яе нязменным кумірам у школьныя і студэнцкія педінстытуцкія гады стаў Рашыд Бейбутаў. Калі па радыё гучала што-небудзь у яго выкананні, яна спяшалася да прыёмніка. Замірала, слухаючы пра незвычайныя дзявочыя вочы, якія ззялі ярчэй за зоркі залатыя і заварожвалі лірычнага героя песні... Іншы раз ёй здавалася — спявае не артыст, а салоўка заліваецца мілагучным спевам. Не менш за чароўны голас спевака ёй падабалася яго аблічча: цёмныя прамяністыя вочы, смуглыя тонкія бровы, чарнюткія, ажно з сіняватым адлівам валасы. У сваім пашпарце Рэня насіла партрэцік любімага выканаўцы.

Як жа прыемна здзівілася яна, калі ў кінатэатры, куды прыйшла ў нядзелю пад вечар паглядзець новы кінафільм, поруч з ёю, на суседнім сядзенні аказаўся малады чалавек у светлым касцюме, вельмі падобны да Рашыда Бейбутава: такі ж смуглы і такі прывабны! Найперш і найбольш яе ўразілі яго карыя вочы, абрамленыя чорнымі і доўгімі, як у дзяўчыны, веямі. Захвалявалася, ёй стала горача. Раз-пораз дзяўчына прыкладвала руку да левай шчакі і вуха, што, здавалася, гарэлі агнём, бо акурат злева сядзеў незнаёмы. «Божа мой, чаго я так хвалююся?! — нарэшце падумала яна, як бы глянуўшы на сябе збоку. — Хто ён такі для мяне? Чужак. Магчыма, завітаў да кагосьці пагасцяваць ці камандзіраваўся ў Беларусь з якой-небудзь сярэднеазіяцкае краіны. Як прыехаў, так і паедзе...» Аднак нейкае незразумелае, невытлумачальнае прадчуванне ёй не дало супакою. «Чаму ён апынуўся менавіта ў Беларусі? — працягвала разважаць Рэгіна. — І што азначае гэты факт: ягонае месца аказалася ўпрытык з маім?» Яе цікавіла многае, калі не сказаць — усё, што датычылася асобы незнаёмага маладога чалавека. Хто ён такі, з якой краіны і з якой мэтай завітаў?.. Словам, ёй хацелася, каб хлопец азваўся да яе, а яшчэ лепей — каб захацеў пазнаёміцца з ёю. У той жа час яна і пабойвалася, каб не заўважыў яе залішняе хваляванне і раптам знячэўку не пасяліў у ейнай душы пачуццё расчаравання...

2

Расчараванне тады абмінула Рэгіну. Тая выпадковая сустрэча, а пазней — новыя невыпадковыя спатканні толькі ўмацоўвалі пачуццё зачараванасці. Незнаёмец (звалі яго Паўлам Царэвічам) аказаўся карэнным беларусам і, галоўнае, добрым, прыязным чалавекам. Рос ён бядовым хлопцам, без бацькі, які лічыўся без весткі прапаўшым на вайне, ды, як высветлілася праз пятнаццаць гадоў, апынуўся ў Польшчы, дзе завёў новую сям'ю. Не ўтаіў Павел ад Рэгіны і матчын «подзвіг»: яна ў свой час завабіла да сябе мужчыну з сям'і, дзе гадаваліся дзевяць ягоных дзяцей.

Шчыры сумоўца, Павел дужа любіў пагаманіць з Рэгінай пра жыццё-быццё. Прасторнымі летнімі вечарамі прывык бавіць час разам з ёю, вольнаю ажно амаль на два канікулярныя месяцы пасля свайго першага года настаўнічання. Часта яны, закаханыя, апыналіся ў раскошных кутках прыроды, патаналі на жытнёвых сцяжынках, у лугавой і лясной нерушы, дзе пачуваліся Адамам і Евай...

Рэгіне падабалася нястомная ласкавасць Паўла, ён цалаваў яе вусны, вочы, бровы, нават радзімкі, пасеяныя невялічкім сузор'ем на яе тонкай белай шыі. І любіў распавядаць, як ён яшчэ школьнікам і пазней, будучы студэнтам будаўнічага інстытута, марыў спаткаць дзяўчыну якраз такую, як яна. «Уяўляеш, — казаў ён, — я хацеў, не ведаю чаму, каб у маёй любай на яе лебядзінай шыі было некалькі радзімак, каб у яе былі натуральныя светлыя валасы. Але галоўнае — каб былі сінія вочы, як нашыя васількі, як бясхмарнае чыстае неба!». Прамаўляючы такія сардэчныя словы, ён браў у рукі букет, у якім пераважалі васількі, паказваў на іх, глядзячы ў вочы дзяўчыны, пасля, усміхаючыся, глядзеў на сінечу неба. Рэгіна цешылася, парадавала і Паўла, калі распавяла пра тое, як хвалявалася і пра што мроіла пры першай з ім сустрэчы ў кінатэатры. Весела яму стала, калі даведаўся пра сваё падабенства з Рашыдам Бейбутавым. Ён засмуціўся, калі пачуў, што Рэгінін бацька быў пры Сталіне зняволены на сем гадоў за непрацяглы нямецкі палон.

Хутка яны зразумелі: жыць не могуць адно без аднаго. Справа рухалася да шлюбу, і тым жа летам маладыя пабраліся. Пакуль былі жаніхом і нявестаю, Рэгініны сяброўкі і знаёмыя, тыя, што добра ведалі не толькі яе, а й Паўла, перасцерагалі яе, раілі не спяшацца замуж за першага стрэчнага: «У цябе ж нікога дагэтуль не было!», «Трэба добра прыгледзецца да свайго абранага», «Трэба пуд солі разам з'есці, каб раскусіць, што ён за птах», і гэтак далей. Некаторыя, маючы на ўвазе ягонага бацькі прыкры ўчынак, намякалі: «Яблычак ад яблыні недалёка падае...». «Што вы такое гаворыце! — амаль абуралася Рэгіна. — Павел харошы!»

3

Павел і Рэгіна Царэвічы сваё сумеснае жыццё пачалі ў хаце Рэгініных бацькоў, а калі праз год нарадзіўся іх першынец-сынок, пераехалі ў сваю кватэру, атрыманую Паўлам ад будаўнічае кампаніі. Праз пяць гадоў у іх з'явілася дачушка. Жылі душа ў душу. Малады муж аберагаў жонку, ва ўсім дапамагаў ёй. Калі яна працавала ў сельскай школе, пад'язджаў у сяло, каб разам вяртацца дадому. Не прапускаў літаратурныя вечары і спектаклі, якія ладзіла Рэгіна для вучняў, дапамагаў рабіць дэкарацыі. Калі яна ўладкавалася ў гарадскую школу і шчыравала там у дзве змены, ён пасля свайго працоўнага прарабскага дня паспяваў да яе прыходу прыбраць у кватэры, выкупаць дзяцей, прыгатаваць вячэру. Рабіў усё не змушана, а натхнёна. Улетку Царэвічы адпачывалі сям'ёю то ў Крыме, то на Каўказе, то ў Прыбалтыцы. Да самазабыцця Павел любіў дзяцей. Калі дачушцы споўнілася пяць гадоў, набыў ёй піяніна, вазіў яе ў дзіцячы сад, у школу сярэднюю і музычную, купляў цацкі. Сына змалку вучыў канструяваць, у раннім узросце навучыў вадзіць машыну.

На два гады Павел з'язджаў у заробкі ў Лівію. Адтуль прысылаў лісты, поўныя пяшчоты. Рэгіна не заставалася ў даўгу, нават вершамі пачала з ім размаўляць. Вярнуўся ён з далёкага замежжа, калі на радзіме быў цяжкі час. Прывёз багата чэкаў, усе аддаў жонцы, каб набывала, што душа пажадае. Мноства падарункаў раздаваў родным і прыяцелям. Да сям'і сваёй стаў ён яшчэ больш уважлівы, як гэта было да паездкі ў Лівію, усіх адорваў падарункамі, ружамі. Аднойчы ўлетку, адправіўшы Рэгіну і дзяцей у Дом адпачынку, зрабіў за кароткі час у кватэры рамонт, купіў новую ванну, газавую пліту, мэблю. Любіў падносіць прыемныя сюрпрызы. Нібыта ўсе яго бясконцыя знакі ўвагі, шанавання і любові былі падрыхтоўкаю да сюрпрызу непрыемнага.

Неяк Павел лячыўся ў шпіталі. Рэня з мамай праведалі яго, сядзелі з ім на лаўцы ў дворыку. Да іх неспадзявана падышла незнаёмая жанчына, якую Павел прадставіў: «Знаёмцеся — Ліза, стрыечная сястра жонкі майго начальніка Ніны Яўгенаўны. У яе муж, сардэчнік, тут лечыцца». Рэгіну трохі засмуціла тое знаёмства непрыемным аблічам прадстаўленай. У яе былі бясколерныя мутныя вочы, тонкія падцятыя губы, шырокі рот, штучная на галаве амаль чырвоная кучма валасоў. Спакваля непакоіла пытанне: «Навошта гэтае знаёмства?»

Пакуль муж лячыўся, пайшлі прапановы ад новай знаёмай: «Можа, вам патрэбная белая фарба?»; «А мо трэба мяса? Я загадваю сталоўкай». «Не, не трэба, дзякуй», — адбівалася Рэгіна ад незразумелае ласкі. А неўзабаве Павел запытаў: «Можна адвезці мне Лізу да знахаркі? Хварэе, бедная, а дактары не могуць памагчы». «Вядома, памажы чалавеку», — сказала клапатліваму Паўлу спагадлівая жонка.

З той пары муж дамоў пачаў вяртацца позна, а то і не вяртаўся, спасылаючыся на камандзіроўкі. Раптам яму спатрэбіліся чэкі, падораныя жонцы... «Ваш муж сустракаецца з Лізай, — сказала Ніна Яўгенаўна, жонка Паўлавага начальніка, Рэгіне. — Нашы ўгаворы не разбураць дзве сям'і адскокваюць ад яе, як гарох ад сцяны». А Рэгіна і сама прадчула Паўлаву здраду.

Дзеці паціху душой акрыялі, сын паступіў у інстытут, выдатна вучыўся. З яго прыклад брала сястрычка. Але сама Рэгіна была ўпала ў дэпрэсію, мужава раздваенне і падзенне, ягоную ганьбу перажывала вельмі хваравіта. Інтымная драма моцна выбіла яе з жыццёвае каляіны

Знайшла віноўніцу на працы. «Ты што сабе дазваляеш?!» — пачала яна канкрэтную гаворку з недарэчнай саперніцай. Лізуня, як яе ўжо называў новы муж, прымружыла вочы і выпаліла як з гарматы: «Ты прыйшла мяне выхоўваць, настаўніца? Ведай жа: мы кахаем адно аднаго, а гэта вышэй за правілы маралі!»

4

Павел Царэвіч, калі маладушна-таямніча сыходзіў ад Рэгіны да іншае жанчыны, не напружваў розум думкамі пра сям'ю, ён быццам знаходзіўся пад уздзеяннем чыйгосьці гіпнозу, не разумеў, не прадбачыў, які ўдар можа адным махам нанесці па ўсіх сямейніках, якія пакуты прынясе ім, а ўрэшце рэшт і самому сабе. Дзесяцігадовая дачушка пыталася ў маці: «Дзе, мамачка, тата? Чаму не прыходзіць дадому?» Пасля, засмучаная, дадала: «Ён такі добранькі, хачу, каб быў дома! Дзе ён, мамачка?» Рэгіна не ведала, што сказаць. Суняць дзіцячае хваляванне, суцешыць дачку не было чым, яна сябе добра ведала: на такія паводзіны каханага заплюшчыць вочы не зможа. «Кажуць, пачаў сабакам сена касіць», — з горыччу адказала яна малой. Балюча ўспрыняў бацькаў учынак сын-юнак, ён рыхтаваўся да чарговага іспыту, паступаў у інстытут замежных моваў. Тады, як асабліва быў неабходны душэўны супакой, камфорт, ён не мог сканцэнтраваць увагу, па паўгадзіны тырчэў над кожнай старонкай канспектаў, слаба засвойваў прачытанае, бо з галавы не выходзіла страшная непрыемнасць. «Мама, няўжо ты не магла сустрэць больш вартага чалавека?», — з адчаем казаў юны максімаліст. «Сам ведаеш, сынок, ён усе нашыя сямнаццаць гадоў быў цудоўным бацькам, а я скажу — такім жа ідэальным мужам. Магчыма, хтосьці сурочыў нас, а мо якія чары на яго навяла-напусціла знахарка, да якой аднойчы звазіў тую пацыентку», — гаварыла яна шчыра і ціха, чым супакойвала і сына, і дачку.

Дзеці паціху душой акрыялі, сын паступіў у інстытут, выдатна вучыўся. З яго прыклад брала сястрычка. Але сама Рэгіна была ўпала ў дэпрэсію, мужава раздваенне і падзенне, ягоную ганьбу перажывала вельмі хваравіта: «Хоць бы чымсьці людскім спакусіўся, а то прыбіўся да нейкае выдры, адно страхоцце!» Інтымная драма моцна выбіла яе з жыццёвае каляіны. Ад глыбокага стрэсу прыключылася анкалогія. Ды яна ўмела не панікаваць, суцешылася, што выявілася каварная хвароба на ранняй стадыі, і лекары справіліся з той бядою.

Развод, на якім настаяла Рэгіна, быў збянтэжыў Паўла Царэвіча, прымусіў пахвалявацца, ён нарэшце ўцяміў, што дарожкі вяртання ў сям'ю няма. Давялося змірыцца з жончынай непрымірымасцю, бо напоўніцу ўсвядоміў сваю здраду, як след ацаніўшы жончыну вернасць.

Новую жонку прапісаў у матчынай двухпакаёўцы. Спачатку жыццё без пастаянных клопатаў ішло весела, яно выглядала гладкаю дарогай, але неўзабаве на той яго дарозе з'явіліся калдобіны, якія паступова паглыбляліся. Пачаліся праблемы са здароўем. Стаў падаць зрок. Пачалі пераследаваць трывожныя сны. А па вяртанні ў суровую рэальнасць: трэба кроплі для вачэй, а не памятае, дзе яны; трэба прыняць інсулін, а няма поруч Лізуні, каб укалола. Якраз у пару нарастаючых недамаганняў Паўла яна ўсё часцей кідала яму з парога кароткае паведамленне: «Міленькі, я паехала...» Ехала яна штодня да новага абранніка, які чакаў яе ў іншым горадзе. Ужо не так часта і начавала дома.

Працяг на стар. 10 (4) »

« Працяг.
Пачатак на стар. 9 (3)

5

Ранейшыя сны Паўла цяжкімі начамі не паўтараліся. Прысніўся новы, як бы здзеклівы сваёй сутнасцю сон: ён, п'яны, барахтаецца ў лужыне, не могучы з яе выбрацца, хвалюецца за прамоклую ў бруднай вадзе апаратку і за сваю намочаную ў нагавіцах «гаспадарку», а да яго пад'язджае аўтамабіль, на якім вялікімі чорнымі літарамі выведзена: МАШЫНА ЧАСУ. Машына адкрытая, у ёй сядзіць ведзьма, яна глядзіць на Паўла-небараку і гучна-гучна рагоча, дэманстратыўна насміхаецца з яго. Павел углядаецца ў нахабнае аблічча ведзьмы і пазнае ў ім тую, што здрадліва пакідае яго ў бядзе. Так, гэта яна — з ненатуральна вогненнай чупрынай, падцятымі фанабэрыстымі губамі і пустымі мутнымі вачыма. Павел намагаецца падняцца, але ніяк не можа, тады штомоцы крычыць: «Згінь, сатана!»...

Неяк, вяртаючыся з паліклінікі, Павел сустрэў Рэгіну. Яна правяла яго да самага дома. «Ведай, Рэнечка, я кахаў, кахаю і буду кахаць толькі цябе!» — сказаў ён былой жонцы на развітанне. Пазней, калі здароўе яшчэ пагоршылася, пачаў скардзіцца Рэгіне і дачцэ на Лізуню: «Яна мяне ўсяляк абзывае, суткамі не бывае дома. Рэнька, я, дурань, так уляпаўся!».

Паміраў Павел Царэвіч цяжка. Яму здрадзілі ногі. Сам не мог дайсці да прыбіральні. Да апошніх ягоных дзён апекавалася ім дачка. Перад смерцю ён папрасіў паклікаць Рэгіну. Калі былая жонка прыйшла, Павел узяў яе рукі, прытуліў да грудзей і сказаў: «Даруй мне за ўсё, любімая!». А ў гэты час на кухні Лізуня з сяброўкамі пахмялялася.

Нарэшце яна займела тое, пра што марыла: прыватызавала кватэру, прапісала ўнука і прытулілася да багача. Праўда, той багач неўзабаве папёр яе з катэджа. А праз два гады яна сышла ў лепшы свет.

Да Рэгіны сваталіся ажно пяцёра мужчын, ды нікому яна не адказала ўзаемнасцю. Прывыкла да сваёй свабоды. Слухае класічную музыку, мулявінскіх «Песняроў»; Рашыд Бейбутаў даўно перастаў быць кумірам. Паўлу паставіла помнік, да якога прыходзіць то з дачкою, выдатнаю праграмісткаю, то з унукам-старшакласнікам. Штодня па скайпу размаўляе з сынам, які працуе архітэктарам у Лондане, і з яго сям'ёю. Не раз вандравала па Вялікабрытаніі ды іншым замежжы. Любіць прымаць гасцей, асабліва сваіх выпускнікоў, найбольш — самых першых, якія запомнілі яе маладою...

21 верасня Васіль Аляксеевіч ЖУКОВІЧ адзначыў сваё 80-годдзе.

Шчыра віншуем нашага паважанага аўтара, сябра Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў, з высокім юбілеем і жадаем яму новых публікацый, здароўя і радасці!

Адценні



Людміла АНДЗІЛЕЎКА

***

Юрася Мікалаевіча Свірку я ўвачавідкі сустрэла на Ушаччыне пад час святкавання ўгодкаў Петруся Броўкі. Падышла да яго з вялікай удзячнасці. Менавіта ён даў мне «пропуск» у літаратуру. Юрась Мікалаевіч прадставіў маю першую падборку абразкоў у «ЛіМе» сакавіцкім нумарам 1994 года. Напісаў харошыя словы. Наўрад ці пасмела б я другі раз звярнуцца ў рэдакцыю якогась іншага часопіса, каб ён «зарэзаў» той мой першы вопыт. І ўжо факт: разышлася б я не толькі з літаратурнай практыкай, а наогул, з роднай мовай. У той адраджэнскі час да мяне толькі-толькі пачало штосьці даходзіць, гады ж мае юныя і леты ўжо збягалі, абавязкі раслі, клопаты трохдзетнай маці шырыліся і не дадавалі вялікіх шанцаў. А мае аднагодкі ў літаратуры ўжо атрымлівалі прэміі і ставілі аўтографы на сваіх кніжках.

— Дык вы зусім не маладая! Як я рад!!! Як я рад, што вы зусім не такая маладая, як падалося мне на фотаздымку!

Можна было проста «дубудаць» ад такога ашаламляльнага адказу на маё шчырае прывітанне... каб было ў ва мне хоць на крышачку больш жаноцкага. Аднак, у гонар сабе, я адмеціла, што разумею яго словы і не крыўджуся, ды, нават, адчуваю цеплыню: ён не палічыў патрэбным прыхоўваць ад мяне зацікаўленасць мной як жанчынай.

— Я ж здымак ваш на сваім стале трымаю і любуюся ім кожны дзень! І каму такое шчасце дасталося?!


Калі ў далейшай размове даведаўся, што «шчасце» аказалася «бязхозным», Юрась Мікалаевіч, пазбаўлены ўсякага ханжаства, пляскаў у далоні і ўжо разважаў зусім па-гаспадарску, не зважаючы на тое, што з майго боку на яго не зададзеныя пытанні пакуль што не прагучала ніводнага слова.

— Але што ж я?! Што я, такі стары, магу вам даць?! Што я магу вам даць?

Каб толькі ведаў ён, што ў маім абсалютным маўчанні на яго знакі ўвагі — па самай высокай меры — зайздрасна мужчынскім падыходзе, хавалася павага і глыбокае жаночае захапленне. Я ўбачыла прыгожага чалавека, мужчыну. У яго блакітных ясных вачах не было і кроплі пошласці і нахабства. Бялюткі як снег, непаслухмяны чуб над высокім, чыстым, светлым ілбом так яўна сведчыў аб яго быкаватым нораве, ніколі не псаваўшым партрэт мужчыны. Даведалася: Юрась Мікалаевіч пахаваў сваю каханую жонку і вельмі пакутуе ад адзіноты. Пакутвала ад адзіноты і я... Дні на Ушаччыне запэўнілі мяне — такія прыгожыя людзі, як Юрась Мікалаевіч, наогул, не часта сустракаюцца ў звычайным асяроддзі. Не была я ўпэўнена ў сваёй яму адпаведнасці і чысціні сваіх разваг, каб схапіць ініцыятыву абранай «музы-сяброўкі». А прыгажосць Юрася Мікалаевіча і грунтавалася менавіта тым, што ўмеў думаць не толькі пра сябе.

***

Ушаччына. Гасцінна накрыты стол для пісьменнікаў (пасля ўрачыстых мерапрыемстваў), музыка, танцы. Неўпрыкмет выкрадаюся на двор падыхаць свежым паветрам у цемру ночы. Як на заказ, з невыноснай дзённай духаты ўліў дождж. Хаваюся пад казырком ганка ад нечаканага абліўня — бліскучай сцэнай з чорнага неба. З вадзяной завесы вынырвае крыху «падмочаны» Пятро Ламан, таленавіты артыст нашага тэатра імя Я. Коласа ў Віцебску, паэт, літаратар. Атрасае з сябе кроплі дажджу, нялоўка мнецца з хвілінку на прыступках і... пачынае спяваць, нічым не папярэдзіўшы свой намер.



Фота www.pixabay.com

Мелодыя нараджалася арганічна, натуральна злівалася з шумам дажджу, плыла, падхопленая моцным ад вільгаці і прыгожым акустыкай рэхам. Гукі ўзнікалі ціха-ціха, маркотнымі, разрасталіся ў глыбіні грудзіны пеюна і выходзілі надрыўна-горка, плакуча, разрываючы санлівую абыдзёнасць, шчымліва-самотныя, затухалі далёка-далёка ў прасторы... То было штосьці незнаёмае, ніколі не чутае, са скарбонкі фальклору, ці сваё, экспромтам? Аднак такое роднае! Такое зразумелае, быццам адкрыўся мне голас усіх маіх ніколі не бачаных продкаў...

Я стаяла зачараваная, баялася варухнуцца, напалохаць рэдкае адчуванне боскай чысціні і праўды быцця, велічы і... адзінства з роднай культурай.

***

Славуты беларускі драматург Аляксей Дудараў мог бы яшчэ стварыць сабе выбітную артыстычную кар'еру ў кінематографе. Яго нешматлікія ролі ў кіно дадалі да шэрагу яскравых, прызнаных і прынятых намі па сваёй абсалютнай нацыянальнай адпаведнасці, вобразаў: Несцеркі, Паўлінкі, Васіля Дзятліка, Чарнушак (бацькі-дачкі), вобразаў, створаных нашымі славутымі Станютай, Гарбукам, Макаравай... свой самабытны, непаўторны, а галоўнае — сучасны вобраз беларуса. У кароткаметражнай стужцы «Госць» герой, сыграны Аляксеем Дударавым такі наш, тутэйшы, знаёмы. Яго знешняя скаванасць, нібы нягнуткасць, зусім не ад «дубаватай» натуры, наадварот, ад напоўненасці пачуццямі тонкай прыроды. Яго сціпласць, нешматслоўе ад сапраўднай вясковай народнай культуры. Вобраз намаляваны не кідкімі, не яскравымі фарбамі — пастэльна, ледзь-ледзь заўважна, тым ён і адпавядае беларускаму лейтматыву. Аднак на такой вастрыні эмоцый, што здаецца — чвэрць крока не ў той бок, і здарыцца крах. Гэтае балансаванне на лязе ўдаецца толькі праз вытанчаную глыбока нацыянальную рысу героя мудрага, памяркоўнага, здольнага адчуваць «чужую» душу, здольнага пакласці сваё я пад ногі, каб падняцца вышэй над сабой. Герой фільма «Госць» аднолькавай крыві з драматургічным героем Аляксея Дударава — Васькам з «Белых рос», якога, на мой погляд, не здолеў раскрыць выдатны расійскі артыст Карачанцаў. Ён не адчуў яго сутнасці, стварыў штучны, не праўдзівы вобраз, якога ў прыродзе не існуе. Карачанцаў іграў простага, добрага, але, насамрэч, крыху дуркаватага дзецюка, які не бачыць відавочнага, ды яшчэ і тэатральна фанабэрыцца ў канцы фільма перад жонкай. Васька павінен быў толькі ўдаваць сябе за «дурня» і рабіць выгляд, што нічога не разумее — вось так, як герой стужкі «Госць», ахвярна паклаўшы сваё я пад ногі дзеля «другі свая». А ў канцы дык і зусім мог неўпрыкмет сцерці слязу, бо на працягу ўсяго камічнага фільма мусіў цярпець боль ад здрады і страх за сваю сям'ю, і, вось, нарэшце, перамог. Герой Карачанцава нічога не адчуваў: ні кахання, ні рэўнасці, ні трагедыі, ні шкадавання...

У літаратуры і мастацтве даўно створаны жыццёвыя нацыянальныя вобразы беларусаў: жанчыны з моцным характарм і мужчыны з мякчэйшым, спакойным, лагаднейшым норавам. Той і другі ахвярныя, той і другі шчырыя, сціплыя. Абодва — крэмень! Гэта — наша нацыянальнае золата: беларускі характар.

***

Калі пачынала пісаць, склала для сябе ў нашай літаратуры некалькі сучасных аўтарытэтаў, і хоць былі яны амаль аднаго са мной веку — палову свайго я паклала на выхаванне дзяцей. На жаль, літаратурна-журналісцкіх ВНУ ці факультэтаў за плячамі не мела — заставалася захапляцца чужым поспехам.

І вось я перад камісіяй літаратараў уступаю ў Саюз пісьменнікаў! У дадатак, як у насмешку майму «самазадавальненню», месца, прысесці пасля апытання, знаходзіцца ля Андрэя Федарэнкі — аднаго з найпершых маіх аўтарытэтаў...

Імя свайго я не любіла... Нечаканае, як гук скінутага на падлогу посуда, халоднае, бы ледавешка, бляклае, быццам позірк недалюбленай жанчыны, зусім выпадковае і невыразнае — Люда. Хто адчувае мяне па сапраўднаму — звернецца дзіцячым да́ўным — Люся, і абагрэе сэрца.

Неяк забягаю ў «Маладосць», дазнацца лёсу выпраўленых поштай абразкоў. Мяне сустракае... сам Федарэнка...

— Люда, ты па апавяданнях? Пачакай... Я іх адрэдагаваў...

Ніколі ў жыцці не ўяўляла, што маё імя такое цёплае і самадастатковае...

***

Адзін мой добра знаёмы выдатны паэт, дзякуючы каму ў свой час я вярнулася да роднай мовы, калі яму засвяціла магчымасць стаць загадчыкам якогась аддзела якогась часопіса, асляплены падманшчыцай планідай, даверліва дзяліўся планамі, марыў:

— Уяўляеш, Людка, — сяджу я за сваім столікам, у сваім кабінеціку, такі густоўна апрануты, у гальштучку, ранішнюю каву пацягваю, а да мяне ідуць, ідуць, ідуць маладыя прыгожанькія дзяўчаткі, вершы нясуць...

Ён жа. Падбягае на паседжанні філіі, мітуслівa падсоўвае якуюсь паперку.

— Людка, трэба падпісаць. Рэкамендуем у Саюз пісьменнікаў.

— Каго?

— Вось... — працягвае самвыдатаўскі зборнік «няслабага», па вонкаваму выгляду, гатунку. Відаць, рэкамендаваная спадарыня ведае сцежкі да вялікіх грошай...

Адкрываю наўгад. «Не топчите воду сапогами!», з пафасам заклікае паэтэса, другі верш, трэці...

— Што гэта?! Мне сорамна.

— Людка, падпісвай. Трэба прыняць. Ёй С. абавязаны... Яна шмат чаго нам зрабіла.

І было б гэта вельмі смешна, каб не так сумна: нацярпелася наша і без таго пакутлівая беларуская літаратура ад «загадчыкаў»...

***

У дзяцінстве каля трох гадоў ёсць кароткі перыяд, калі ў вочы яму немагчыма зазірнуць — адразу пырснуць слёзы ад нейкага невыноснага святла, што ліецца з вачэй малога. Быццам апякае! Як нельга зірнуць адкрытымі вачыма на сонца. Гэта той час, калі крыху падрослае, аддаліўшыся ад мамкі, дзіця пачынае «падключацца» да космасу, і ў той нядоўгі момант сам Бог пазірае на нас праз дзіцячыя вочы. Лічаным адзінкам людзей удаецца зберагчы і пранесці гэтае святло ў сваіх вачах праз усё жыццё.

У вачах Алеся Пісьмянкова жыло такое святло.

Подых палыновы



Антаніна ХАТЭНКА

Радаўніца

Бела-бела вальсуюць вішні,
асыпаючы долу цвет.
Лёгка-лёгка снуе Правышні
з цвету ўпалага шлях траве.

І адхуквае і аблашчвае
рой пялёсткавы ў далані,
хоць нябыт згаладалай пашчаю
праглынае вякі і вагні.

Ясна-ясна плыве над цемрай
у карункавых строях сад.
Там, дзе ўчора свята памерла,
рассвітальна зіхціць раса.

Уздымаецца сад на дыбачкі
ў набрынялых пупышках дум.
Хто мне выбачыць, хто мне выбачыць,
што ў разгубе дамоў іду?..

Што ў парваным нітве карэння
ледзьве ўздрыгвае чуйны пульс...
Хто мне верне вясну, хто верне?
Адгалосак чакаць адкуль?

А ля весніц анёлы-яблыні
парасхрыставалі весне ўвыш.
І ў блакіту нябёс ядвабную
ахінуўшыся, ты стаіш.

З матылёваю хваляй згадак
перашэптваюцца знічы.
Ды ляціць над самотным садам
голас нечый. Нічый. Нічый...

Спластаваны гады памкненнямі
ў плашчыню ўдзіраванелых эр.
Над маленнямі й летуценнямі
толькі саду крыло цяпер.

Развінуліся птахі й вішні,
павяртаныя ў рай здаля.
З-пад вясёлкавай Брамы вышняй
сцежкаю белаю продкі выйшлі
ў сад, дзе гоіць часы Зямля.

23.04.2018

Подых палыновы

...І развінулася святлынь
з прадна, са споду.
І лашчыў срэбраны палын
дарогі подых.

У той дарозе ноч і дзень
счапілі крылы.
І сыплюць зоры на людзей,
каб свет адкрылі.

Каб з-пад цяжкіх, як твань, павек
расплюшчыў вочы
век, што з-пад радасці плыве,
ды ў цемру збочыў.

Каб з цёплай-цёплай глыбіні,
што Род калыша,
гук адпачатны парадніў
бяздонні й вышы.

Каб зноў прасвечвалі дажджы
скразную далеч,
дзе Ўсё надыхваецца жыць,
што мы з'ядналі.

Што свет пращыла, як прамень
змярканні-ўсходы,
Дзядоў нітуючы й мяне
ў мембранны подых.

...І разамкнуліся крыжы
прышэсцяў-сконаў.
Празрыста жывяць капяжы
карэнне з кроны.

13.07.2018

Да цябе

...І ўзышла цішыня
спаміж вечара й дня
ў векаўлонні начы,
скуль наступнасці ўсчын
мякка коцяцца ў сне
ад цябе да мяне.

У скразной цішыні
спамяні ці прысні
сум-валошкавы свет,
што плыве і плыве
да цябе ад мяне
першакветна ў вясне.

Зоркі, як птушанят,
туліць ноч-цішыня.
Растае, быццам час,
горыч-ростань між нас.
І святлее ў вакне
ад цябе да мяне.

У цянётах, на дне,
думкам вусцішна днець.
А ў маёй цішыні
золак чыста звініць
спадалёк, з яснаты,
стуль, дзе ты. Стуль, дзе ты...

05.04.2018

Кладачка

Там, дзе парастак мой
прабівае да Бога дарогу,
ні афіш, ні прамоў,
ні вырокаў, ні прэмій — нічога
не набыць, не прыдбаць
ні лісліва, ні зманна, ні здрадна.
Ані плач, ні журба,
ні чужыя праклёны й дарады
ўжо няўладныя Там,
дзе сцябліны ўрастаюць у крону,
дзе мой парастак Сам —
пакаранне сабе й абарона.

Тут нідзе, анідзе
на шляху ні вяхі ні падказкі.
Сонца кругам ідзе,
абыякава сеючы ласку.
А на Дрэве Жыцця
не злічыць ні шнароў, ні адмецін.
Хто ж нітво перацяў,
што ўплятала мой свет у Сусвецце?

Недзе парастак мой
прарастае ў нябёсы з цямрэчы.
Над бядой, над зімой
вецце Роду вядунскае ўкленчыць.
Ды галосяць вятры.
Над былінкай шугаюць, шугаюць.
Як з надрыву ў прарыў
закувае зязюля над гаем.

І куванне, як звон,
б'е ў гарачыя лёхі паветра.
Рвецца, рвецца нітво —
перавясла вышыняў і нетраў.
Гнуткі парастак мой
уздымаецца ўгору ва ўтоме...
Ані сноў, ні замоў...
Толькі ціша завейная ў доме.

15.01.2018

Кругабег

Як загаслі ўсе зоркі,
адквітнелі ўсе краскі,
адшугалі вятры. І дажджы адгулі...
Як чаканне прагоркла.
І зглупотнелі казкі...
Як абрынуўся час у віры нематы...
ТЫ прыйшоў. І ўзвінуў кругабег
на Зямлі.
У бязвер'і з'явіўся ратункава ТЫ.

07.06.2017

Аднойчы

Янку Купалу

Не хлопчык. Не лётчык. Лячу.
Рукі распростаў крыллем.
Мабыць, пралёт пачую
Цішу адчайнай хвілі?..

А хто там ідзе? Паэт.
Гул застывае ў скронях.
Боль здрыгануўся ў свет
з лесвіцы. З рук Харона?

Ці згадкі. Ці думкі. Лісцё
падае з дрэва Роду.
Дзе ж ты цяпер, жыццё,
доранае народу?..

І песня і праўда — на збыт.
Карнік. Святар. І Плачка.
Нехта тут не забыт.
Той, хто штурхнуў — не йначай.

А неба? А зоры? Маўчаць.
Прыступка лязом блішчастым
раскроіла лёс і час.
Упасці. Вось воля й шчасце.

Аднойчы. Далёка. Прысню
абдоймы сцюжэлай ночы,
сяброўскіх вачэй хлусню,
руку на плячы... Аднойчы.

* * *

Развітанне з Радзімай.
Паланэзу разлёт.
Тут суворыя зімы.
І падманнасці лёд.

Рэхам клавішы плачуць.
Памяць пальцаў баліць.
Можна ўсё перайначыць
на краёчку зямлі.

На краёчку мелодый —
матылямі з-пад рук...
Сэрцу цёмна й халодна.
...Уздымуся й згару.

Толькі яскры над полем.
Толькі попел — у дол.
Я шукала тут Волі:
до-рэ-мі-фа-соль... до.

Развітанне з краінай,
што не стала гняздом.
Па-над лёсам — правіны.
І надзей повен дом.

Ні парэнчаў, ні лесвіц
па-за Домам няма.
Можна ўсё перакрэсліць —
і абдыме зіма.

Край у красках і снезе —
неўспяванае "ЛЯ"...
Там плывуць паланэзы...
Там світае зямля...

13.08.2017

Адтуль

Згадваецца, мроіцца ці сніцца?
Плача вечар на тваім плячы.
Пахнуць золкам цёплыя суніцы,
дзе мой шлях сыходзіць на спачын.

Недзе за гаямі й халадамі
цёхкаюць бяссонна салаўі.
Прападае шлях мой, прыпадае
згораным пяском да ног тваіх.

За дзвярыма кон, як змрок, гусцее.
Мне б цябе ўначы асцерагчы!
Прабяруся ў дом ціхуткім ценем
(ну, хіба прыкмецяць касачы...)

Як тужліва леты адцвіталі
ў ростанях у колішнім жыцці!
Вось між нас няўдоленая далеч —
ні пачуць, ні ўбачыць, ні дайсці!

Толькі часам згадваецца-сніцца,
як вятры арганныя гулі,
падалі жальбіннаяігліца
і твае тры прыгаршчы зямлі...

09.10.2018

Адвітанне

Павяртаецца памяць шторання
з цемравое мядзянай гары.
І ў вакне маім, як на экране,
адвітальна кастрычнік гарыць.

Над віхурамі вогненных танцаў
уздымаецца памяць штодня.
Быццам хоча навечна застацца,
каб кагосьці абняць-засланяць.

Але ўсё тут згарае, згарае
ў пуставейнае шэрае тло.
Грае-грае да самага краю —
і змаўкае. Нібы й не было.

У вакне маім, як на экране,
меладрама любові й тугі.
Зачароўвае восень і раніц:
на вагні ападаюць снягі.

Ападае сухое суквецце.
Так на прысак сыходзіць агонь.
І чаго мы шукаем па свеце?
І каго тут чакаем, каго?

Дзён сувой заснаваны на кросны —
пранябеснае памяці ўток.
Неўміручасць кранаецца хросна,
нібы струнаў, напятых нітоў.

Так шыкуюцца дрэвы да балю —
вершаліне цалуюць вятры!
І звіняць невідзёны-цымбалы —
аж чутно на мядзянай гары.

А з вакна майго помнае ранне
сумна лашчыць лісцё ў прамянях.
З неба продкі глядзяць на экране
меладраму насталага дня.

23.10.2018

Зорны бор

Можа, я калі-небудзь забуду
гэты бор у шаўковых імхох,
у якім заблудзіліся гуды,
ціха ўпаўшы, як голка — у стог,
у сівыя-сівыя паданні,
у гранoе-гранoе гудво,
над заранкамі і над слядамі,
над жыццём і над сконам, што ўдвох
карагодзяць, вядуць, карнаваляць
у праменнасці й змроку часоў...

Стаімо мы з табой на прагале,
дзе апошні ручай перасох,
уцямнелы, засыпаны друзам, —
ні прабіцца на свет, ні загрань...
Перад намі хваіны, як музы.
І расстання святая пара.

Вось адслонімся ў вечнасць, як гуды,
ператворымся ў зорны пясок.
А ў бары ўсё ўздыхацімуць дуды,
асыпаючы цвет верасоў
і над цішай, і над перагудам,
і над багнай, і ў прошчы жытла.
...А над борам, як гімн, — песні-збуды
узлятаюць з агнішча, са тла:
"Я ніколі свой Край не забуду.
Не забуду, што я тут была".

08.12.2017

Лёсы паўстанцкіх

Вызвольнае паўстанне 1863–1864 гадоў было адным з нешматлікіх ва ўсёй гісторыі XIX стагоддзя прыкладаў, калі найлепшыя людзі паняволенага народа паўсталі супроць велізарнай імперыі. Яны самаахвярна баранілі сваю чалавечую і нацыянальную годнасць, змагаліся за незалежнасць і вяртанне з імперскай «турмы народаў» у Еўропу, да якой спрадвеку належала Вялікае Княства Літоўскае. Цэлы год аддзелы каліноўцаў, якім не хапала зброі ды вайсковага досведу, супрацьстаялі ў шмат разоў большай і выдатна ўзброенай царскай арміі. Гэта стала магчымым не толькі дзякуючы гераізму паўстанцаў, але і таму, што нашых ваяроў разам з Кастусём Каліноўскім узначальвалі адважныя і адданыя справе камандзіры. Многія з іх мелі вайсковы талент і добрую вайсковую падрыхтоўку, маглі высока падняцца па царскай службовай лесвіцы, аднак абралі шлях барацьбы за вольную будучыню роднай зямлі. Большыня паўстанцкіх камандзіраў загінула ў баях, на расейскіх шыбеніцах ці на катарзе, астатнія мусілі пакінуць Айчыну.



Уладзімір АРЛОЎ

Нязломны Урублеўскі

Адзін з найбліжэйшых паплечнікаў Каліноўскага нарадзіўся ў мястэчку Жалудок на Гарадзеншчыне. Бацька будучага героя Антон доўга быў ляснічым у прынёманскіх пушчах і перадаў сыну любоў да лесу. Пасля Віленскай гімназіі Валер Урублеўскі паступіў вучыцца ў Пецярбургскі лясны інстытут.

Яшчэ ў гімназічныя гады Урублеўскі стаў перакананым патрыётам роднага краю. Вялікі ўплыў на юнака меў віленскі дзядзька Яўстах. Ён часта пераапранаўся са шляхецкага адзення ў сялянскую світку і вандраваў па навакольных вёсках, быў улюбёны ў беларускую мову і народныя песні, што любіў спяваць сваякам і сябрам. Царскія ўлады абвінавацілі дзядзьку Яўстаха ў спробе стварыць таемную арганізацыю і прысудзілі яму сібірскую катаргу. Валер запомніў дзядзьку і яго спевы на ўсё жыццё. Некаторыя даследчыкі лічаць, што гэта сам Урублеўскі склаў пазней песню, якую ў змагарным 1863-м зноў і зноў заводзілі на паўстанцкіх маршах і прывалах:

Ах ты мая чарнабрыва,
Будзь здарова і шчаслíва!
Люблю цябе, любіць буду
І ніколі не забуду!
Ой, у хаце не астацца,
Калі трэба ісці драцца…

У Пецярбурзе студэнт Урублеўскі ўступіў у нелегальны гурток на чале з афіцэрамі Зыгмунтам Серакоўскім і Яраславам Дамброўскім. Яны ўхвалілі тое, што Валер добра знаецца ў тапаграфічных картах, надзіва трапна страляе і ўпэўнена валодае шабляй. Гэтыя здольнасці маглі вельмі спатрэбіцца ў час збройнага змагання. На адным з паседжанняў адбылося знаёмства Валера з землякамі — Віктарам і Кастусём Каліноўскімі.

Сябры па барацьбе былі радыя, што Урублеўскі атрымаў пасля інстытута прызначэнне ў егерскую вучэльню ў Саколцы, паблізу ад Белавежскай пушчы. Вучэльня рыхтавала лясных аб'ездчыкаў і егераў-паляўнічых. Гэта давала добрыя магчымасці для падрыхтоўкі будучага паўстання, пагатоў Валер праз некалькі гадоў стаў загадчыкам навучальнай установы. Сялянскія юнакі, скончыўшы егерскую навуку, раз'язджаліся па розных кутках краю з пасеянымі ў душы зернямі вальнадумства і вызвольных ідэяў. Шмат хто вёз з сабой і «Мужыцкую праўду», у выданні якой браў удзел Валер Урублеўскі.

Напярэдадні збройнага выступу Урублеўскага прызначылі паўстанцкім начальнікам Гарадзенскай губерні. Разам з Каліноўскім ён належаў да «чырвонага» лагера, што змагаўся не за Рэч Паспалітую, а за незалежную Літву-Беларусь. У першыя ж дні паўстання Валер ужо вёў сваіх ваяроў у бой у Сакольскай пушчы. Ягоныя падначаленыя пазней вызвалілі Ружаны і не раз выходзілі пераможцамі ў сутычках з карнікамі.

Урублеўскі тройчы асабіста вадзіў сваіх людзей у атаку на расейцаў у адным з баёў у Ружанскай пушчы. На парадзе ўсіх паўстанцкіх сілаў Гарадзеншчыны, які адбыўся ў тых самых лясах, свайму камандзіру салютавалі шэсць тысяч змагароў. Паўстанская прэса паведамляла пра шэсць тысяч штыкоў, але насамрэч большасць паплечнікаў Урублеўскага тады былі ўзброеныя ўсяго толькі косамі. Як і Каліноўскі, Валер у тую змагарную вясну часта ўручаў героям баёў галінкі каліны з белымі кветкамі.

Імя Урублеўскага ведаў увесь наш край. Генерал-губернатар Мураўёў-Вешальнік стварыў для яго захопу адмысловую групу, але ўсе ейныя намаганні былі марныя, хоць некалькі разоў пашыраліся чуткі пра смерць камандзіра. Увосень Валер перавёў свае аддзелы на зімоўку ў Польшчу. Аўтарытэт Урублеўскага быў такі вялікі, што яго прызначылі вайсковым начальнікам адразу двух ваяводстваў: Люблінскага і Падляшскага. На пачатку 1864-га Валер пад Люблінам трапіў у засаду кубанскіх казакоў і быў цяжка паранены, але сябрам удалося вывезці героя за мяжу.

Урублеўскі, гэтаксама як і тысячы іншых змагароў, апынуўся ў Францыі. Жывучы ў Парыжы, на жыццё ён зарабляў цяжкай працаю ліхтарніка і друкара. Вайсковы досвед знакамітага паўстанца спатрэбіўся ў час французскай рэвалюцыі, якую называюць Парыжскай камунай. Валер Урублеўскі атрымаў званне генерала і стаў камандзірам адной з трох рэвалюцыйных армій. Поплеч з ім на баку камунараў ваявалі болей за 600 былых паўстанцаў. На парыжскіх барыкадах Валер сустрэў свайго былога настаўніка з Віленскай гімназіі, ліцьвінскага патрыёта і выдатнага спевака італьянца Ахіла Банольдзі. У перапынках паміж баямі Ахіл, пакуль не памёр ад атрыманых цяжкіх ранаў, заўсёды спяваў таварышам па зброі песні на дзесяці мовах. Сэрца Урублеўскага, як і многіх камунараў-суайчыннікаў, найбольш кранаялі родныя беларускія спевы.

Пасля тых падзей Урублеўскі жыў у Лондане, сябраваў з філосафам Карлам Марксам, таемна прыязджаў у Расейскую імперыю і, магчыма, сустракаўся з беларускім рэвалюцыянерам-«нарадавольцам» Ігнатам Грыняўіцкім, які выканаў смяротны прысуд цару Аляксандру II. Пахаваны герой паўстання 1863 года на славутых парыжскіх могілках Пер-Лашэз, дзе спачываюць шмат якія знакамітыя асобы еўрапейскай гісторыі.

Пярсцёнак Серакоўскага

Будучы бясстрашны паўстанцкі камандзір Зыгмунт Серакоўскі вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце, але за ўдзел у нелегальных суполках трапіў на вока жандарам. Юнака выслалі салдатам-шарагоўцам у далёкі Арэнбургскі край. Там Зыгмунт блізка пасябраваў з украінскім пісьменнікам Тарасам Шаўчэнкам, які таксама стаў царскім салдатам не па сваёй волі.

Праз восем гадоў Зыгмунту Серакоўскаму ўдалося вярнуцца ў Пецярбург. Ён на выдатна скончыў расейскую Акадэмію генеральнага штаба і служыў у вайсковым міністэрстве. Ягонае начальства меркавала, што Зыгмунт раскаяўся за памылкі юнацтва і стаў верным расейскім падданым. Яно і не падазравала, што Серакоўскі, якому давалі важныя заданні і пасылалі ў замежныя камандзіроўкі, вядзе падрыхтоўку да збройнай барацьбы за вызваленне Айчыны. У час паездак у еўрапейскія краіны Зыгмунт пазнаёміўся з расейскімі рэвалюцыянерамі-эмігрантамі Аляксандрам Герцэнам і Мікалаем Агаровым, з палітыкам Джузэпе Гарыбальдзі, які ўзначальваў змаганне за свабоду і аб'яднанне Італіі.

Калі на радзіме пачалося вызвольнае паўстанне, палкоўнік Серакоўскі пакінуў службу і прыехаў у Вільню. Дасведчанага афіцэра прызначылі камандаваць збройнымі сіламі на Ковеншчыне. Пад свае сцягі Зыгмунт хутка сабраў болей за дзве тысячы ваяроў. Некалькі разоў яны рабілі ўдалыя засады на расейскія войскі і наносілі ім вялікія страты. Падначаленыя Серакоўскага здабывалі перамогі і ў адкрытых баях з карнікамі.

У траўні 1863-га паўстанцкі камандзір павёў змагароў свайго злучэння ў Курляндыю. Так тады называлася частка Латвіі, што некалі ўваходзіла ў Рэч Паспалітую. Зыгмунт разлічваў узняць на збройную барацьбу латышоў і эстонцаў. Напачатку паўстанцам спадарожнічаў поспех. Апрача шляхты да змагароў далучалася шмат сялянскай моладзі. Серакоўскі часам мусіў нават абыходзіць вёскі, бо не меў для юнакоў зброі. Але імкненне змагацца за волю было такім моцным, што сяляне ўсё роўна далучаліся да паўстанцаў, маючы на ўзбраенні толькі сякеры. Пад камандаваннем Серакоўскага быў і аддзел з 500 сялянаў, узброеных адно цапамі. Ваяроў з косамі называлі касінерамі, а вось адважных сялянскіх хлопцаў з цапамі ахрысцілі цапавікамі.

Расейскія ўлады былі напалоханыя і выслалі насустрач нашым змагарам вялікія сілы. Карнікам усяляк спрыялі курляндскія немцы-абшарнікі. Каля мястэчка Біржы паўстанцы пацярпелі паразу. Цяжка паранены Серакоўскі трапіў у палон. Віленская моладзь склала план нападу на турэмны шпіталь і вызвалення паўстанцкага правадыра. Калі Зыгмунту перадалі ліст пра гэта, ён не пагадзіўся, бо ведаў, што Мураўёў-Вешальнік, каб адпомсціць, учыніць у Вільні жорсткую расправу, якая можа забраць дзясяткі жыццяў.

На допытах Зыгмунт, нягледзячы на пакуты ад ранаў і тры аперацыі, адмовіўся даваць паказанні на сяброў і паплечнікаў. Раз'юшаны Мураўёў-Вешальнік загадаў правесці ваенна-палявы суд каля ложка нямоглага целам, але магутнага духам паўстанца. Суддзі пастанавілі расстраляць «асабліва небяспечнага мяцежніка», але Мураўёў паводле сваёй звярынай завядзёнкі замяніў расстрэл на павешанне. У адным з апошніх лістоў на волю Серакоўскі пісаў: «І стоячы пад шыбеніцай, буду пратэставаць супроць варварскага бяспраўя, якое прынесла маскоўская ўлада маёй дарагой Айчыне».

Уначы перад пакараннем на загад Вешальніка да Зыгмунта прывялі ягоную юную жонку Апалонію. Тая ўжо чакала дзіця. 15-хвілінная спатканне праходзіла пад аховаю пятнаццаці царскіх салдат і афіцэраў. Апалонія размаўляла з мужам, укленчыўшы перад яго ложкам. Праз некалькі гадзін вайсковы доктар перадаў ёй Зыгмунтаву цыдулку: «Анелі мая! Жыць і быць вольным магу, толькі выдаўшы сяброў. Ніколі не здолеў бы зрабіць гэта, таму падпісаў сабе смяротны прысуд. Памру чысты і незаплямлены. Буду кахаць цябе, буду лунаць над табой і нашым немаўлём».

На месцы павешання Серакоўскага ў Вільні ўсталяваная мемарыяльная пліта. На ёй побач з імем непахіснага Зыгмунта — імя паўстанцкага правадыра Кастуся Каліноўскага, які быў пакараны смерцю на тым самым Лукішскім пляцы.

У нашы дні пад час раскопак на цяперашняй гары Гедзіміна, дзе расейскія ўлады таемна хавалі паўстанцаў, археолагі зрабілі незвычайную знаходку — шлюбны залаты пярсцёнак. На ім захаваўся надпіс: «Зыгмунт і Апалонія», а таксама дата шлюбу. Пярсцёнак удакладніў месца пахавання Серакоўскага і стаў памяткай пра ягонае ўзнёслае ўзаемнае каханне.

Пад мянушкаю «Тапор»

Віленскі генерал-губернатар Назімаў у 1860 годзе атрымаў новага падначаленага — выпускніка Акадэміі генеральнага штаба паручніка інжынерыі Людвіка Звяждоўскага. Сваёй адукаванасцю і цудоўнымі манерамі Людвік, які вярнуўся на службу ў родны горад, хутка заваяваў у Назімава вялікі аўтарытэт і стаў ягоным ад'ютантам. Царскі вяльможа і ў страшным сне не мог прысніць, што пасля ўзорнага выканання абавязкаў удзень Звяждоўскі вечарамі на таемных кватэрах абмяркоўвае будучае збройнае змаганне з каланізатарамі.

Да ліпеня 1862-га менавіта Людвік узначальваў Літоўскі камітэт падрыхтоўкі паўстання. Калі на стол генерал-губернатару легла данясенне пра падазроныя сувязі ад'ютанта, той не даў веры, але мусіў перавесці свайго ўлюбёнца ў Маскву. Сярод «сумнеўных» знаёмых Звяждоўскага ў жандарскіх паперах згадваўся нейкі Вікенцій Канстанцін Каліноўскі. Далей ягоны след губляўся, хоць якраз да Каліноўскага пасля ад'езду Людвіка з Вільні перайшло кіраўніцтва Літоўскім камітэтам.

Як толькі найлепшыя людзі краю ўзяліся за зброю, капітан Звяждоўскі вярнуўся ў Літву-Беларусь. Пад канспірацыйнай мянушкаю «Тапор» ён стаў паўстанцкім начальнікам Магілёўскага ваяводства. Людвік меў план: злучыць у адзін моцны кулак віцебскія і магілёўскія аддзелы каліноўцаў і перанесці паўстанне на беларускую Смаленшчыну, а затым у Расею, ажно да самай Волгі.

У шынялі афіцэра Расейскага генеральнага штаба Звяждоўскі на чале сваіх ваяроў на шэрым кані заязджаў у кожную сустрэтую па дарозе вёску і склікаў сялянаў на агульны сход. Камандзір паўстанцаў абвяшчаў, што аддае вяскоўцам усю зямлю без выкупаў і павіннасцяў. Ён абяцаў адмену рэкруцкіх набораў і свабоду веры.

У траўні Людвік асабіста кіраваў захопам павятовага горада Горкі. Гэты поспех так спалохаў царскія ўлады, што ваявадь з некалькімі сотнямі нашых патрыётаў з магілёўскіх аддзелаў царскія ўлады кінулі цэлую дывізію. «Тапор» з падначаленымі апынуўся ў атачэнні. Ворагі мелі пяхоту, кавалерыю і артылерыю. Каб уратаваць сваіх людзей Людвік загадаў ім па адным прабівацца на захад і працягваць барацьбу ў іншых аддзелах.

Звяждоўскаму заставалася ўсяго некалькі месяцаў жыцця. Ён яшчэ паспеў паваяваць з карнікамі на польскіх землях,

камандзіраў



Гара Гедзіміна.
Фота racyja.com

дзе камандаваў Кракаўскай паўстанцкай дывізіяй. У лютым 1864 года Людвік трапіў у палон і праз лічаныя дні быў павешаны. Яму ішоў 35-ты год.

Людвік Нарбут

Бацькам гэтага героя паўстання быў славуты гісторык Тэадор Нарбут. Ён часта казаў сыну, што гісторыя — найлепшая настаўніца жыцця. Так лічыў яшчэ старажытны прамоўца і мысляр Цыцэрон. Людвік сапраўды вельмі любіў аповеды старэйшых пра часы незалежнай ліцьвінскай дзяржавы і кнігі пра нашую даўніну. Якраз гісторыя, як гэта часта бывае, выхавала ў юнака любоў да Айчыны і самаахвярнасць.

У васямнаццаць гадоў вучня апошняга класа Віленскай гімназіі Людвіка Нарбута арыштавалі за спробу стварыць таемную арганізацыю для падрыхтоўкі паўстання. Справа зацікавіла самога імператара Мікалая І, якога нездарма празвалі Палкіным. З Пецярбурга прыйшоў жорсткі цароў загад: небяспечнага гімназіста пакараць розгамі і аддаць у салдаты.

Людвіка чакала неверагодна цяжкая васьмігадовая служба. У лістах з Каўказа, дзе ваяваў ягоны полк, салдат-штрафнік прасіў родных прыслаць яму валошку ці каласок з родных палёў. Даслужыўшыся да афіцэрскага звання, Нарбут атрымаў права пакінуць войска і адразу вярнуўся на радзіму. Лёс падараваў яму шчасце з жонкай Амеліяй. Але яно было нядоўгім: у Літве-Беларусі пачалося паўстанне.

На пачатку лютага 1863 года Людвік у родным маёнтку Шаўры атрымаў з Вільні загад аб прызначэнні яго вайсковым начальнікам Лідскага павета. На праводзіны сабралася ўся вялікая сям'я Нарбутаў. Людвік быў узброены рэвальверам і старой каўказскай шабляй. Сястра Тэадора ўручыла яму вышыты сваімі рукамі баявы сцяг-харугву з «Пагоняй». Паўстанцкага камандзіра багаславілі бацькі, абняла маладая жонка, якая не здолела стрымаць слёз, і Людвік разам з братам Баляславам і шасцю аднадумцамі развітаўся з мірным жыццём.

Праз месяц аддзел Нарбута вырас з васьмі да 80 ваяроў і працягваў хутка папаўняцца. Поплеч са шляхтай у ім гераічна змагалася з карнікамі шмат навакольных сялян-касінераў. Сярод падначаленых Людвіка, якога сучаснікі называлі «выразнікам духу і гераізму эпохі», быў і вядомы мастак Міхал Андрыёлі.

Пасля некалькіх удалых баёў з царскімі войскамі паўстанцкае кіраўніцтва надало Нарбуту званне палкоўніка. Ягоныя сілы пагражалі адначасова Вільні і Гародні. Генерал-губернатар краю прызначыў за галаву Нарбута буйную грашовую ўзнагароду і накіраваў на тры сотні змагароў, узброеных паляўнічымі стрэльбамі ды косамі, дзве тысячы салдат і казакоў.

Паўстанцкі лагер быў у Дубіцкім лесе над ракой Котрай. Цішыню травеньскага леса парушалі адно птушыныя спевы. Аднак гэты спакой быў падманным. Здраднік ужо падводзіў да лагера расейскіх карнікаў. Ім удалося напасці на нашых ваяроў знянацку. Людвік загадаў адступаць у дзве лініі: адна адстрэльвалася, другая тым часам перабягала і залягала. Але камандзіра параніліі. Паплечнікі падхапілі Нарбута на рукі і панеслі, ды выратаваць ужо не змаглі, бо другая куля прынесла смяротную рану. Развітваючыся з гэтым светам, Людвік прамовіў: «Як соладка памерці за Айчыну...»

Расейскі афіцэр дазволіў пахаваць усіх палеглых паўстанцаў каля Дубіцкага касцёла, аднак Мураўёў-Вешальнік распарадзіўся касцёл разбурыць, а магілы зраўняць з зямлёй. Пазней у рукі карнікаў трапіў і Баляслаў Нарбут, які камандаваў лідскім аддзелам пасля смерці брата. Яго чакалі дваццацігадовая высылка ў Сібір і невылечная тады хвароба — сухоты. Старога Тэадора Нарбута за дрэннае выхаванне сыноў і дачкі царскія служкі таксама асудзілі на сібірскую высылку, але не паспелі выканаць прысуд, бо шанаваны ў краі вучоны-гісторык сканаў. Ягоная жонка Крысціна вярнулася з высылкі праз два дзесяцігоддзі.

Так каланізатары расправяляліся з цэлымі сем'ямі патрыётаў.

У вёскі Шаўры, якая цяпер у Воранаўскім раёне, каля могілак стаіць мемарыяльны валун з надпісам: «Нарбутам — удзельнікам паўстання 1863–1864. Нашчадкі».

Браты Далеўскія

Гэты беларускі род даў нашай гісторыі шмат патрыётаў і змагароў за свабоду. Францішка і Аляксандра Далеўскіх царызм арыштавалі ў 1848 годзе за стварэнне таемнага таварыства «Саюз літоўскай моладзі». Пад час следства і на судзе браты паводзілі сябе надзвычай цвёрда, не выдалі нікога з сяброў і былі адпраўленыя на катаргу ў Сібір. Пасля дзесяцігадовай катаржнай працы на нерчынскіх шахтах-капальнях Аляксандр захварэў і памёр, а Францішак у 1863-м стаў адным з кіраўнікоў паўстання.

Малодшыя Далеўскія — Цітус і Канстанцін — вучыліся ў Віленскай гімназіі адначасова з многімі будучымі вядомымі паўстанцамі, сярод якіх былі Францішак Багушэвіч і Зыгмунт Мінейка. Браты ў тыя гады праславіліся не толькі як вальнадумцы. Уся былая сталіца захаплялася імі як неверагодна смелымі плыўцамі, якія выратавалі некалькі чалавек, што танулі ў рацэ.

У пару студэнцтва ў Маскоўскім універсітэце юнакі зрабіліся сябрамі таемнага таварыства «Агул», якое налічвала паўтысячы сяброў. Нягледзячы на маладосць, ліцьвіны Далеўскія мелі там вялікі аўтарытэт. Сямнаццацігадовы студэнт юрыдычнага факультэта Цітус, апрача іншых адказных даручэнняў, стаў скарбнікам і збіраў з таварышаў грашовыя ўнёскі. Аднойчы ён з аднадумцамі нёс па горадзе вялікую скрыню з рэвалюцыйнымі адозвамі да расейскіх салдат і сялянаў, аднак «нелегалаў» нечакана напаткаў паліцэйскі патруль. Напалоханыя хлопцы разбегліся, і з цяжэзнай скрыняй застаўся адзін Цітус. Разумеючы, што, калі адозвы патрапяць у рукі жандараў, будзе вялікая бяда, ён з апошніх сіл дацягнуў скрыню да парапету набярэжнай і скінуў яе ў раку. Падбеглы патруль Цітус увёў у зман, выдаўшы сябе за вар'ята. Так ён ўратаваў цэлую арганізацыю.

Калі на радзіме разгарнулася збройная барацьба, Цітус адразу ж накіраваўся з Масквы дадому. Ён хацеў далучыцца да паўстанцкіх сілаў Зыгмунта Серакоўскага, мужа сваёй сястры Апалоніі. Там ужо ваяваў брат Канстанцін. Аднак Цітус атрымаў іншае заданне. Ён займаўся забеспячэннем паўстанцаў неабходнымі звесткамі ды прыпасамі і праславіўся як адзін з самых надзейных ды няўлоўных сувязных і экспедытараў.

Цітус вельмі блізка пасябраваў з Каліноўскім і стаў ягоным сакратаром. Іх зблізілі і агульныя погляды, і тое, што абодва мелі нарачоных з віленскай сям'і Ямантаў: Кастусь — Марыю, а Цітус — Алену. Тым часам кватэра Ямантаў зрабілася сапраўдным штабам змагароў.

Старэйшы з братоў Далеўскіх — Францішак — таксама быў у кіраўніцтве паўстання, аднак належаў да лагера «белых». Для царскіх уладаў гэта былі не менш небяспечныя ворагі. Калі жандары здолелі арыштаваць Францішка, ён быў асуджаны на смерць. Сям'і ўдалося захаваць яму жыццё, выкарыстаўшы скваппасць Мураўёва-Вешальніка. Той атрымаў за Далеўскага і яшчэ двух паўстанцаў, прысуджаных да смяротнага пакарання, велізарныя тады грошы --15 тысяч рублёў і замяніў смерць на сібірскую катаргу.

Канстанцін Далеўскі пасля таго, як карнікам удалося разбіць Серакоўскага пад Біржамі, стварыў свой паўстанцкі аддзел. Баявыя сябры захапляліся вытрымкай і нязменным спакоем камандзіра. Ён часта аддаваў загады пад градам непрыяцельскіх куляў і сам вадзіў паплечнікаў у атакі. У адным з баёў Канстанцін быў цяжка паранены,аднак, загаіўшы за мяжой рану, вярнуўся ў свой аддзел і зноў ўзяў у рукі зброю. Праз восем гадоў ён змагаўся на барыкадах Парыжскай камуны і загінуў за свабоду Францыі.

Калі паўстанне ў Літве-Беларусі дагарала, Цітус Далеўскі часта мяняў падпольныя кватэры, жыў пад рознымі прозвішчамі, але яго ўсё ж схапілі. Пасля безвыніковых допытаў сябра і сакратара паўстанцкага правадыра расстралялі на Лукішскім пляцы ў Вільні, там, дзе сустрэў смерць ад рукі царскага ката і Каліноўскі.

Герой двух народаў

Заможныя бацькі хацелі даць сыну Зыгмунту добрую адукацыю. Малады Мінейка паступіў у Пецярбургу ў адну з самых прэстыжных навучальных устаноў Расейскай імперыі — Акадэмію генеральнага штаба — і павінен быў стаць вайсковым інжынерам. Але юнак хутка далучыўся да вызвольнага руху. Прыязджаючы на вакацыі ў бацькоўскі маёнтак Балванішкі (цяпер Зялёны Бор) на Ашмяншчыне, сталічны студэнт сустракаўся з аднадумцамі, марыў пра будучае паўстанне ды імкнуўся стаць патрэбным не расейскаму войску, а паняволенай Айчыне. Хутка ён вымушаны быў пакінуць навучанне і вярнуцца ў родныя мясціны.

Пераапрануўшыся ў сялянскае адзенне, Зыгмунт вандраваў па вёсках: разносіў і чытаў сялянам антыўрадавыя ўлёткі. Паліцыя зацікавілася незвычайным падарожнікам, і ён, каб не трапіць пад арышт, з'ехаў за мяжу. У Італіі Мінейка пазнаёміўся з Джузэпе Гарыбальдзі, быў запрошаны выкладаць фартыфікацыю ў Генуэзскую вайсковую школу, якую заснаваў гэты знакаміты рэвалюцыянер.

Дачуўшыся, што на землях Літвы-Беларусі ўспыхнула паўстанне, Зыгмунт выправіўся на радзіму і стварыў ашмянскі аддзел ваяроў. Каланізатары добра памяталі, як гераічна змагалася за свабоду Ашмяншчына ў 1831 годзе. Тады паўстанцы занялі Ашмяны, за што потым расейскія карнікі выразалі там палову жыхароў. Баючыся страціць мястэчка і цяпер, улады паслалі супроць некалькіх дзясяткаў нашых ваяроў моцныя армейскія сілы. Змагары працярпелі паразу, а іхні камандзір апынуўся ў палоне.

Мінейку чакала пятля расейскага ката. Але прага Мураўёва-Вешальніка да грошай была такой бязмежнай, што Зыгмунтавай маці пашанцавала выкупіць сынава жыццё за дзевяць тысяч рублёў. Павешанне замянілі на дванаццаць гадоў катаржнай працы на сібірскіх капальнях. Мінейка не скарыўся: ён уцёк з Сібіры і здолеў дабрацца да Еўропы. Ягоныя інжынерныя веды былі высока ацэненыя ў Галандыі і Францыі, Балгарыі і Турцыі, але сваёй другой радзімай былы беларускі паўстанец абраў Грэцыю.

На старажытнай грэцкай зямлі Зыгмунт Мінейка будаваў масты і чыгункі. Ён паспяхова займаўся археалогіяй і знайшоў славуты храм Зеўса ў Дадоне. Наш суайчыннік удзельнічаў у аднаўленні Алімпійскіх гульняў. Ён рэстаўраваў легендарны Мармуровы стадыён у Афінах, які стаў сімвалам першых сучасных Гульняў 1896 года. За вялікія заслугі ўрад Грэцыі надаў Мінейку званне ганаровага грамадзяніна гэтай краіны.

Рамуальд Траўгут

Рамуальд нарадзіўся на Берасцейшчыне, а скончыў вядомую вальнадумствам сваіх выхаванцаў Свіслацкую гімназію. У дзевятнаццаць гадоў ён паступіў на вайсковую службу, а ў трыццаць шэсць быў ужо ў чыне падпалкоўніка. Начальства абяцала Траўгуту далейшую кар'еру і казала пра недалёкае генеральскае званне, але ён нечакана выйшаў у адстаўку і пасяліўся ў палескім маёнтку Востраў паблізу Кобрына.

Да паўстання заставаліся лічаныя месяцы. Былы баявы афіцэр разумеў, што перамагчы велізарную армію Расейскай імперыі немагчыма, але, калі прыйшла пара, без роздуму зрабіў свой выбар і ўзяў у рукі зброю. Увесну 1863-га кобрынскі аддзел паўстанцаў здабыў шэраг перамог над карнікамі. Ужо ў першым баі царскія войскі страцілі 70 салдат і афіцэраў, пасля чаго, не перажыўшы такой ганьбы, камандзір расейцаў застрэліўся. Пазней Траўгут здзейсніў паўстанцкі паход на Піншчыну і Ўкраінскую Валынь.

Пасля жорсткіх баёў у антопальскіх лясах у Пецярбург было адпраўленае радаснае данясенне, што адзін з самых небяспечных паўстанцкіх важакоў забіты. Але Траўгут застаўся жывы. Яго два тыдні хавала і лекавала ў сваім доме маладая сувязная змагароў Эліза Ажэшка, якая пазней стане знакамітай пісьменніцай і напіша творы, прысвечаныя героям 1863 года. У яе карэце Рамуальд пад выглядам сваяка выехаў у Варшаву. Неўзабаве ён узначаліў патрыятычны Нацыянальны ўрад і стаў на чале ўсяго паўстання.

Траўгут ведаў, што няроўная барацьба непазбежна скончыцца паразай, але адмовіўся ратаваць сабе жыццё, з'ехаўшы за мяжу. Увесну 1864-га Рамуальда схапілі, а ў жніўні, пагардліва зірнуўшы на царскага ката, ён узышоў на эшафот з шыбеніцай.

Помнік Рамуальду Траўгуту ўсталяваны ў горадзе Свіслач побач з помнікам Кастусю Каліноўскаму.



Фота www.pixabay.com

На фоне неба



Марыя БАРАВІК

Грак не чорны...

Рытмам сэрца я кажу аб чым?
Грак не чорны. Ён увесь блішчыць.
Сонца на крыле яго гуляе.
І натура спраўная якая!
Як будуе ён сабе жытло,
Дык яго пранізвае святло.
Ён адкрыта здабывае «хлеб»,
Колерам выразны у святле.
У святле бярэ грудзьмі вятры.
Бачу яго звонку і знутры.
Пачынаю бачыць пакрысе:
Без святла мы чорныя, усе.
Нам бы ўспыхнуць светла за святло,
Каб жыццё выразнасць набыло.
Без выразнасці самота ад жыцця —
Колераў няма ў ім, пачуцця.

Ля параф'янаўскай шашы

Глядзіць на шлях і ўсё чакае
Напругай зроку і грудзей.
«Звёз», — гэткім словам называем
Учынкі здрадлівых людзей.
Звёз бездакорнага, хто верыў,
Свайму адзінаму служыў.
Звёз, бо знутры глухі і шэры.
Звёз, бо без кропелькі душы.
Як гэта рэч: во гэта пуга,
Во гэта йржавае вядро.
І ўжо здзіўляецца акруга:
«Хоць дождж ідзе, хоць з неба гром —
Сядзіць сабачка...». Адзінокі
Ля параф'янаўскай шашы,
Маўчыць на галасы і крокі —
На покліч з нейчае душы.
«Свайго» ён любіць і чакае
Вачмі, душой, сэрцабіццём...
Як мне сказаць, бяда якая,
Што мы душою не расцём?

Самадакор

Не дрэва — шугануў самадакор.
Прыйшоў ён засяліцца ў думны бор:
Імкне ў здуменне і расце штодня.
Я адчуваю, як душу заняў.
Стаіць ён нейкай помнасцю у ёй —
У сарцавіне памяці маёй.
Здаецца — для яго няма й віны.
Дык во прысніўся сон, які заныў...
Во ён шчыміць у самай глыбіні:
У голасе самотнай цішыні.
Вылазяць думкі, нібы мышкі з нор:
Чуваць, як шалахціць самадакор.
За што і за каго самадакор
Во тут, каля зямлі, не каля зор.
Каля цябе найпершай у душы,
Хто бездакорна заклікае жыць?..
Жыццё бяжыць, жыццё вакол — напор!
А ў сарцавіне дум — самадакор.
Насуперак? Ці ён наперакон
Патрабавальна ззяе, як закон?

На фоне неба

*

Убачыў Бог, што я — адна.
Мяне наблізіў да вакна —
Святлом мой голас апярэдзіць.
Зірнула: воблакі — суседзі;
Пад імі — бусел і гракі
І два ствалы, як дзве рукі,
На фоне неба, дзе — парадак,
Адкуль святло ідзе на радасць.
Але каму яе данесці —
І перадаць як дабравесце?

*

Падумала: мо ў красавік,
Ужо ў бары нeледзяным,
Назначаны мне баравік,
Пад мохам, крыху вадзяным?
Зляклулася: мо рэжуць дрэвы?
Налётам! Як ля дома, злева,
З бярозкі паднябессе зняілі
І два гнязды гракоў, як шалі?
Двухствольная слязой цячэ
На дол. Дык і ў душу яшчэ.

*

Я помню, мама здзіў іскрыла
Наўсход ад хаткі, на гары:
«Зірні, дачушка, — гаварыла —
Не прапусці пары-зары,
Калі Іван дудой разбудзіць
Рыканне — цішу надрываць —
І кожная кароўка будзе
Грымучым басам падпяваць».
У гэтым звоне-перагудзе
Быў покліч — радасна дняваць.
Мы з мамай песціліся ў цудзе —
Расой смяялася трава.
Як помню, мама здзіў іскрыла
І ў цёплым сонечным віры...
Жыву і адчуваю крылы
Ружовай раняшняй пары.

Да Святога Панцеляймона

О, Святы Панцеляймоне!
Да Цябе — «ручай» наш сёння.
Ты ў бальніцы нашай госць,
І ўсё бачыш Ты, як ёсць:
На якім жыццёвым фоне,
О, Святы Панцеляймоне,
Перад вобразам Тваім
На канвееры стаім.
Перад мошчамі Тваімі,
Перад мошчамі Святымі
У аслабленым хаўрусе,
У хваробе Беларусі,
У святле ляніва-шэрым...
І чакаем лекаў верай.
О, Святы Панцеляймоне —
Апякуне медыцыны!
Мы ж у слабасці ў палоне
І сабою, і Айчынай.
Во душа мне плоць трывожыць
(Паспрыяй ёй сілай Божай!)
Перад вобразам Тваім
Плача шчырасць і наіў.
Чым лячыць нам веру сёння?
О, Святы Панцеляймоне!
Дзе ёсць веры вітамін,
Падкажы, Святы!
Амін!

Пад ззяннем думкі

У чыстым полі згадкі расцвілі,
І вочы з полем родна абняліся.
Хоць недзе ёсць падобныя палі,
Нябесныя і воблачныя высі,
У гэтым полі скалыхнуўся жаль,
Як васілёк у шквале навальніцы.
Пасмакавала сэрца часу даль,
І з думкі вуснаў выцякла крыніца.
У полі, поўным помнага святла,
У родным полі хоча плакаць доля.
Во тут душа сямейная жыла
Цярпліва, нескароная няволі.
Во тут у полі разам мы былі.
Дык ясна, так, як сонца полю свеціць,
Як ззянне зорак час не аддаліў,
Як час не знік у Божым запавеце,
І, як жывая памяць расцвіла
Пад ззяннем думкі з боскага святла,
Я маю бацькаўшчыну — мілую Айчыну —
Дык прыцягнення вечную прычыну.
О, Patria, усё ж чакай зару!
Пакуль жыву — сцвярджаю Беларусь,
Праз колер слова, рытм сэрцабіцця
У сувязях любімага жыцця.

Востраўская восень



Мікола КАНАНОВІЧ

***

Шапоча вераснёўскі дождж.
Пра што ж? —
Пра канцасць і бясконцасць часу,
І камара, заразу,
Што ў хату ўлез, звініць над вухам,
А ты тут слухай.
А можа ён тут шэпча мне
Пра край у тле? —
Адно дакладна, пэўна — восень.
Мне заўтра бульбу з поля зносіць,
Капаць, сагнуўшыся... у кульбу.
Мне дождж прабулькаў
Пра няспыннасць часу
І сплыннасць нашу.

***

У Востраве ідзе вялікі дождж.
— Вяровачкамі з даху ўецца,
— кажа маці.

***

Вароты восені схаваліся ў дажджы,
Які сцяной паўстаў над дальнім лесам.
— Ў грыбы не йдзі. Лепш дома паляжы,
Ці кніжку пачытай вунь з інтарэсам... —
Ці маці кажа так, ці голас мой
Унутраны мяне трымае ў хаце.
Тым часам дождж сцякае ў дол вадой,
А я шукаю рыфму на Парнасе.

***

Ну вось і ўсё. Паеду заўтра ў горад
Колю Дамановіча хаваць.
У 60 зямляк у вечны холад
(Ці ў рай нябесны?)
выйшаў зімаваць.
У Вострава яго не павязуць,
На Чапялёўскім ляжа палігоне,
Хоць маці з бацькам пахаваны тут
І ўсе браты —
у востраўскім палоне.

Але абжыўся ў Слоніме, і там
Наканавана выспацца Даману.
А Вострава схаваецца ў туман
Чарговую сваю залечваць рану.

Вострава.
2017

***


Імжыць ледзь прыкметны дождж,
Сцякаюць кроплі
па лісточках кветак
І віснуць на пялёстках басаног,
Празрыстасцю зіяючы адметнай.
А з даху кроплі
ў выварку бубняць,
Што дождж не скончыцца,
пара выходзіць з хаты —
Пад вераснёўскім небам пастаяць
Ды па грыбы спяшаць
у лес багаты.

***

Востраўская восень: бульба, дождж,
А хочацца — на рыбу ці ў грыбы.
І я вастру старэнькі бацькаў нож,
Каб быў гатовы і туды й сюды.

І хай ніхто не пойдзе пакрыўджаным,

або Грак і Монця Хрысцік



Валер ГАПЕЕЎ

(Урывак з рамана)

* * *

Вітольд Сямёнавіч Прыходзька кіраваў універсітэтам апошні год — пенсійны век надышоў незаўважна, і так дзякуй, што далі папрацаваць тры годзікі звыш нормы. Хоць тое «дзякуй» важыла для Прыходзькі зусім не мала, калі казаць адкрыта.

Заставалася яшчэ два тыдні адпачынку. Ідэя мець сваю невялікую копанку на ўчастку захапіла Прыходзьку не на жарт. З аднаго боку, водапровод — зручна! Але ж, халера, хіба можна параўнаць: колькі ён вады ліе на сваім участку і колькі іншыя? Казалі пра лічыльнікі — ніяк не вырашаецца пытанне. А так кіне насос невялікі — і палівадь добра. Ды і вада, вада якая! То ж сапраўдная, азёрная, з яе карысць! Самы вугал участка нізкі, жонка тут агуркі садзіць, паліваць не трэба — гэтак многа вільгаці. Тут і быць копанцы.

Меў Вітольд Прыходзька ў запасе адну невялікую хітрасць. Да азярыны праз невялікі лужок нічыйнай зямлі — шэсць дзясяткаў крокаў. Закончыцца сезон, а зямля не схопіцца яшчэ маразамі, то пракапаецца вузенькая, у адно лязо рыдлёўкі траншэйка. Туды ўкладзецца труба. І пабяжыць вадзічка з азярыны ў копаначку. Усё акуратна закапаць, замаскіраваць — хто што дакажа? Ды і якая тут каму справа? Траншэю нойме кат копаць, каб за паўдня паспець...

Фізічную працу Прыходзька не любіў, але прымушаў сябе працаваць, бо тлушч на пузе стаў перашкаджаць завязваць шнуркі чаравікаў. Калі збіраешся ехаць у сучасны еўрапейскі горад жыць, мусова форму адпаведную мець. Жонка ўпарціцца наконт пераезду. Вітольд намякаў Эльвіры, што варта і ім падумаць, як бы гэта ўслед за сынам асесці ў Нямеччыне, а яна маўчала. Колькі разоў гасцявала ў сына, песціла ўнучку, але хутка пачынала сумаваць. Вось па гэтых градках. Праўду кажуць: можна выехаць з вёскі, ды вёска з цябе не выедзе. Такая во жонка дасталася. А доктар навук! Ты скажы, як пасля сарака гадоў абудзілася, ажно выбухнула ў ёй жаданне корпацца ў зямлі. З аднаго боку і няблага: вунь колькі грошай эканоміцца — свае гуркі, памідоры, варэнні за зіму не з'ядаюцца. Ну і магчымасць зганяць наетае пуза, хоць, трэба прызнацца, не дапамагае тое калупанне ракам у градках. От сапраўдная работа — копаначку выкапаць! Тут папацееш добра!

...Вітольд Прыходзька капаў няспешна, заганяючы лязо рыдлёўкі ў мяккую чорную зямлю. Зямлю выкідаў побач — раннюю цыбулю жонка ўжо выбрала, а гуркі ў гэтым годзе вымерзлі. Шкада, але яшчэ градка вышэй ёсць.

Зямля на паўметра ў глыб была зусім вогкая, кідаць было цяжка. Чарговы раз наступіўшы нагой у старой красоўцы на лязо, Прыходзька пачуў непрыемны металічны скрыгат. Камень, падумаў ён. Падагнаў лязо ніжэй, капнуў...

Металічная іржавая скрыня, памерам са звычайную кнігу, таўшчынёй акурат у том кшталту «Вайны і міра». Завэдзганая ў чорную гразь. Прыходзька не паспеў як след здзівіцца і спрактыкавана дзеўбануў рыдлёўкай у вечка. Вострае металічнае лязо зрабіла шырокую, праз усю скрыню, дзірку, метал накрыўкі высыпаўся ў скрыначку.

І адтуль засвяціла жоўтым.

Прыходзька спудкана прысеў, кінуў рыдлёўку, працягнуў рукі, якія раптам затрэсліся, да дзіркі, разагнуў ломкія краі шчыліны. Кінуліся ў вочы жоўтыя кружкі і паўкружжы з характэрным металічным зззяннем.

Сэрца закалацілася пад горлам.

Устаў на ватных нагах, зверавата агледзеўся.

Жончына постаць, сагнутая ўдвая, цямнела ў цяпліцы. На суседнім участку мужык круціўся ля сваіх кустоў парэчак — вырэзваў лішняе, у ягоны бок не глядзеў.

Вітольд разважаў хвіліну.

Схапіў скрыню, засунуў пад майку разарванай накрыўкай да жывата, пад гумку шортаў, сагнуўся і выкараскаўся з ямы. Так, сагнуўшыся, падаўся хутчэй у дамок — бы яму хапіла жывот.

Ён лічыў пра сябе: дванаццаць, пятнаццаць, дваццаць два, дваццаць тры... дзверы!

І ліхаманкава забегалі вочы: дзе, дзе схаваць? Куды пакласці?

Адзінае патаемнае месца — непрыбітая як след дошчачка сцяны ля халадзільніка. Даўно Вітольд такую штуку зрабіў. Сюды якраз ставіцца тры паўлітры чаго хочаш. Вітольд ставіў свой любімы напой — ром. Хоць жонка лічыла, што ён любіць каньяк. Але ж, халера, у суботу пасля лазні яна дазваляла адно сто пяцьдзясят грамаў. І куды дзявалася тады рахманая вяскоўка? Тыгрыцай кідалася на бутэльку: «Ня дам больш ні кроплі!». Ну і прасіць не стану. Ідзі з бутэлькай — дзівіся на свой серыял. А ён — нібыта адчыніць халадзільнік у пошуках скрылька сала, дастане бутэльку і ліне сабе на глыток-другі...

У хованцы адна бутэлька. Памесціцца скрынка. Не змог утрымацца, хапіў бутэльку і глынуў адзін і другі раз добра, ажно запякло ў горле. Не перажываў, што Эльвіра, жонка, унюхае. Хай чуе. Няма чаго баяцца бабскіх енкаў.

Выйшаў і закрыў дамок на ключ.

Капаў і кінуў рыдлёўку: ну, не дурань жа, га? У яго — грошай на рахунку, каб купіць кватэрку недзе ў прадмесці Берліна. А ён капае зямлю, як затурканы раб.

У яго — золата!!!

Што гэта золата, што сапраўднае, Вітольд не сумняваўся: скрынка металічная згніла ад іржы, а яно захавалася ды жаўцее, то сапраўднае. Бачна, не толькі манеты. Хоць і тыя вялікія, і не скажаш, што нашы, у сэнсе царскія-расейскія. Нейкія там іншыя выявы. А калі манеты маюць якую гістарычную каштоўнасць? О, гэта цэлы капітал...

Ён вылез з ужо немалой ямы, сеў на яе бераг, звесіўшы ногі ў чарнату дна. Пачуліся крокі, азірнуўся — падыходзіла Эльвіра.

— Вітольд, ты чаму дзверы замкнуў? — выказала сваё незадавальненне.

У выцвілым старым, таму занадта цесным купальніку, цела яе бачылася яшчэ больш адрузлым, чым падчас яе распранання ў лазні — вывальваліся, ніяк не ўмяшчаліся ў бюстгальтар поўныя абвіслыя грудзі, складка жывата напалову закрывала трусы. А некалі ж яна ў гэтым купальніку была такой сексуальна-звабліваі!

— Зачыніў. Бо ці мала хто можа шмыгнуць!

— А што там красці? — здзівілася жонка. — Кефір з халадзільніка?

— А хоць і кефір! Мінералкі хачу! І баршчу.

— Халаднік жа ўчарашні ёсць, — пачала Эльвіра і спынілася, адчуўшы асаблівае напружанне ў настроі мужа. — Нейкі ты ўзвінчаны. Добра, звару, але ж трэба ехаць па косткі.

— Дык з'ездзі! — не змог стрымаць эмоцый, нервова крыкнуў Прыходзька. — От зарэ бяры і едзь! І мінералкі вазьмі, і смятаны паболей, ведаеш, я з баршчом многа яе ем, — сцішыўся ён прыканцы.

— То дай ключ, пайду збірацца.

Ехаць жонцы ў бліжэйшы магазін было нядоўга — туды-там-назад — паўгадзіны. Але гэтага павінна было хапіць, каб уважліва разгледзець змесціва той скрыначкі, якая цягнула, бы магнітам.

Прыходзька зачыніў за сабой дзверы на ключ і зашчапку, завесіў вокны. Дастаў з кладоўкі вялікі стары ручнік, пасцяліў яго на падлозе і потым адкрыў схованку і выцягнуў скрынку.

Вытрас змесціва на ручнік. Розум адмаўляўся верыць вачам: нейкія вялікія дзіўныя манеты з дзірачкамі, зробленымі, відавочна, каб насіць як упрыгожванне, розныя падвескі невялікія, бранзалеты на руку... Не наша, не беларускае, вырашыў Вітольд, бо меў усё ж першую адукацыю гісторыка.

Нават думкі не ўзнікла пра тое, каб адкрыта заявіць аб знаходцы. Маленькая згадка ў якой газеце і слава на тры дні з нібыта павагай знаёмых і аднаразовымі іхнімі ж каментарамі ў сацсетках: «Ну і дурань!». «Навошта яму гэта?» О, ён ведае, як дзяржава ацэньвае клады — як лом! Дзе знайсці пакупніка?

Прыходзька пералічыў цяпер ужо сваё, ён не сумняваўся ў гэтым, багацце: пяць залатых невядомых манет з дзіркамі — гэта невялікі кошт, сапраўды, як лом ацэняць. Затое: дзевяць манет меншых, цэлых, чатырнаццаць розных падвесак, дзве — з зялёнымі камянямі, відаць, смарагдамі, вялікімі, тры зашпількі на сукенкі, пяць бранзалетаў. Колькі ж гэта каштуе?

Сфатаграфаваў усё паасобку.

Загарнуў у ручнік скрыначку, засунуў яе далёка за дошку сцяны, ледзь рука даставала, застаўся задаволены: не відаць, хай і адкрыецца выпадкова схованка. Узяў бутэльку каньяку з бара, дастаў шклянку, наліў, сеў, адкінуўшыся на спінку крэсла, пацягнуў напой і сам выцягнуўся, ажно спіна наструнілася: ах, як жа пашанцавала!

Пачуўся шоргат шын па жвіры двара — прыехала жонка.

* * *

Грак апусціў бінокль, хмыкнуў:

— А ты сумняваўся! Калі чалавек браў хабар хоць адзін раз, такі ўжо не задумаецца, што рабіць са знойдзеным кладам! Што робім, Монця?

Яны сядзелі ў мансардным пакоі дамка непадалёк ад лецішча Прыходзькі — дамовіліся з гаспадаром наконт «пракату пакоя».

— Думаю, ён сёння з'явіцца са сваімі фотаздымкамі дзе-небудзь на сайтах нумізматаў і калекцыянераў. Адсочваем.

Грак кіўнуў у знак згоды, спытаў з усмешкай:

— А цябе сумленне не пачне мучыць? Жыў чалавек, быццам і не благі, а ты яго органам дзяржаўным здасі?

Мацвей узняў кубак, зазірнуў у яго — з кавы заставалася гушча, з уздыхам паставіў на столік.

— Нічога супраць сумлення мы не рабілі. У чалавека ў любым разе ёсць выбар. «Вучоны заўсёды павінен быць дзяржаўнікам», — гэта ён сказаў мне, выкідваючы з магістратуры. Хай паказвае вернасць сваіх слоў на практыцы. Не! — рашуча ўжо гукнуў Мацвей. — Без сантыментаў. Мы не пазбаўлялі яго выбару, ён не прайграў бы, калі б у гэтыя гадзіны на яго ным лецішчы быў вэрхал ад знойдзенага клада з журналістамі ды тэлебачаннем. Сквапнасць узняла верх — хай наракае на сябе. Але ў яго яшчэ ёсць шанец, мо адумаецца, калі даведаецца пра каштоўнасць.

— Калі даведаецца пра кошт, то апошнія сумненні, як яны ў яго і былі, знікнуць, — махнуў рукой Грак. — Такія асобы мне вядомыя.

Позна ноччу на гэтым жа лецішчы Мацвей сёрфіў сеціва ў пошуках пастоў Прыходзькі. Ён не памыліўся: Вітольд на трох рэсурсах зарэгістраваўся пад выдуманымі нікамі, паказваў свае знаходкі, пытаўся: каго цікавіць, ці ўвогуле гэта каштоўнасць, колькі можа каштаваць. Карацей, прыкінуўся сапраўдным лузерам, які «ад бабулькі на памяць атрымаў». Паведамленні Прыходзькі не засталіся незаўважанымі: было досыць каментаў і допісаў кшталту: «Напісаў у прыват».

Раніцай за кавай Грак падвёў рысу над сваімі і Мацвеевымі сумненнямі:

— Няма чаго разважаць. Жонка Прыходзькі паедзе з лецішча, значыць, ён дамовіўся з пакупніком. Сёння гэта робіцца на раз-два. Пакупнік нічым не рызыкуе — ён калекцыянер, едзе купляць рэч. Пра яе гісторыю ён ведаць не абавязаны. Іншая справа, што прыехаць можа аптавік. Упусцім — дарэмна патрацілі каштоўнасці.

— Не спрачаюся, — пагадзіўся Мацвей. — Пабачым.

Пабачылі: аўтамабіль з жанчынай сапраўды з'ехаў з лецішча Прыходзькі.

Грак дастаў тэлефон, раскрыў яго і ўставіў іншую сімку:

— Гэта расейская, левая, не знойдуць. Алё, міліцыя? Губляюся, вам гэта званіць, ці не. Тут такая справа: наш сусед па лецішчы выкапаў клад... А вы не перабівайце, усё скажу! І не жартую я! Золата нейкае, я бачыў дакладна. І сёння ноччу ён дамовіўся з пакупнікамі, яны прыедуць да яго днём. Маё прозвішча? Навошта вам, вы мне дзясятую долю ад клада не дасце, так жа? А вось адрас суседа... Так, я не жартую, далібог. Слухайце, можаце мне не верыць. Зараз усё сфатаграфую, вазьму тыя запісы, якія сусед пакідаў на сайтах калекцыянераў і адпраўлю вышэй, у КДБ. Там зразумеюць, што справа сур'ёзная, але клад ужо згубяць! А вы будзеце тады адказваць! Добра, я зараз вам эсэсмэскай адпраўлю спасылкі на запісы майго суседа ўчарашнія і тыя вырабы, якія ён прадае.

Прайшла гадзіна, другая, Грак не стамляўся ўважліва аглядаць пасёлак з бінокля. Маўчаў, соп злосна, нарэшце выгукнуў:

— Ага! Паверылі! — і стаў узбуджана каментаваць убачанае: — Насупраць нас дамок. Толькі што прыехаў чорны аўтамабіль, выйшла двое, адзін застаўся. Падняліся наверх, бачна было, як на мансардным акенцы фіранкі варушыліся. Усё, наш Прыходзька пад назіраннем!

Прайшло яшчэ з тры гадзіны, і да лецішча Прыходзькі падкаціў нічым не прыкметны аўтамабіль. Гаспадар яго, ніскарослы, з барадой і лысінай мужчына гадоў шасцідзесяці, у светлым гарнітуры, выйшаў з чорным саквояжам, пачакаў, пакуль Прыходзька мітусліва адчыніць веснічкі. Яны прайшлі ў дамок. Праз хвілін пятнаццаць да лецішча падляцелі два аўто, чацвёра мужчын выскачылі з іх, адзін пераскочыў на надворак праз плот, адчыніў веснічкі. Праз паўхвіліны яны былі ля дамка і настойліва загрукалі ў дзверы. Тыя адчыніліся — трое зайшло, адзін застаўся.

Праз паўгадзіны ўсе выходзілі з надворка, накіроўваліся да веснічак.


Прыходзька ішоў, ледзь перастаўляючы ногі. Ягоныя рукі былі спераду, і іх запясці злучалі кайданкі.

— Вучоны павінен быць дзяржаўнікам, — ціха пракаментаваў Мацвей.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 9 (157) | 27 верасня 2019 | № 36 (647) Новы час

Пра Дмытра Паўлычку, карпацкага легіня, што дарос да вяршынь сусветнай паэзіі

Нашы чытачы наўрад ці ведаюць гэтае экзатычнае слова «легінь». Існуе яно ва ўкраінскай мове для азначэння хлопца, які нарадзіўся ў Карпатах і надзелены ўсімі станоўчымі якасцямі, што ўвайшлі ў ментальны імператыў народа. Па дасягненні паўналецця юнак павінен прайсці ў сваёй грамадзе абрад ініцыяцыі, у выніку малады хлопец атрымлівае права насіць зброю — карпацкі тапірэць! Яму, што засведчыў сілу і розум, пры абароне сябе, свайго краю, дазволена забіваць ворага.



Фота www.dzerkalo.media

Удзячна тлумачэнне закладзена інтрадукцыя да асноўнай характарыстыкі ***Дмытра Васільевіча Паўлычкі,*** народжанага ў карпацкім сяле на Гуцульшчыне ў 1929 годзе, сёння знакамітага пісьменніка, грамадскага дзеяча, дыпламата, якому 28 верасня ўдзячная супольнасць будзе адзначаць высокае ***90-годдзе з дня нараджэння.***

Пачатак майго знаёмства з юбілярам прыпадае на нашу сумесную львоўскую ўніверсітэцкую філалагічную маладосць. Паўлычка-малады паэт, друкаваўся з 1951 года, аспірант, і я, студэнтка-пачатковец, атрымалі ад рэктара Львоўскага ўніверсітэта, незабыўнага наша куміра, мудрага і прагрэсіўнага Яўгена Канстанцінавіча Лазарэнкі не загад, а «ўрок» з просьбай годна адгукнуцца на міжнародныя падзеі, што, як на той час, атрымлівалі важкі народазнаўчы статус. Я. Лазарэнка засяродзіў нас на антыімперыялістычнай рэвалюцыі на Кубе. У 1960-я гады з'явіліся Гаванскія дэкларацыі, што сталі праграмай барацьбы кубінскага народу за нацыянальную незалежнасць. Кіраўніцтва СССР наладжвала мерапрыемствы ў падтрымку народу Кубы, вітаючы найперш сацыяльную матывацыю паўстанцаў. Наш рэктар, акадэмік мінералогіі з сусветным імем, вызначаўся высокай культурай, веданнем еўрапейскіх літаратур і, найперш, роднай украінскай. Ён ведаў тое, што не паспелі яшчэ асвоіць мы як філолагі. Аказваецца, яшчэ ў далёкіх 1880-х украінец Барыс Грынчэнка ўзнімаў голас дэмакрата ў абарону кубінцаў, напісаўшы цікавую паэму «Мацільда дэ Аграмантэ».

З падачы рэктара я выступіла з адпаведным дакладам на Першай Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай краінам Лацінскай Амерыкі, што адбылася ў Маскве пад патранатам Пасольства Кубы. Дмытро Паўлычка, дзякуючы Я. Лазарэнку, атрымаў магчымасць здзейсніць падарожжа на Кубу. Блаславенне рэктара стала для Паўлычкі адной з вызначальных форм інтэлектуальнай ініцыяцыі, што вылілася ў напісанне ім у 1962 годзе кнігі вершаў і прытчаў «Жест Нерона».

Пераканана: згаданы «рэктарскі ўрок» для Паўлычкі стаў магутным каталізатарам выспявання ўсёй шырыні далейшай філасофскай нацыянальна-вызваленчай праблематыкі, якая з неспадзяванай яшчэ для тагачаснага мастацтва сілай выбухнула некалькі раней у яго зборніку «Правда кличе» (1958). Ідэйна-кампазіцыйны стрыжань кнігі — санет «Коли помер кривавий Торквемада» — прагучаў ёмістай алегорыяй дыктатарскага рэжыму ў Краіне Саветаў. Наклад кнігі быў знішчаны. Вытрымаць ціск ідэалагічнай апрацоўкі, што абрынулася на аўтара пад «жэстамі навейшых неронаў», было не проста. Аднак Дмытро Паўлычка выстаяў. Ён быў прадвеснікам эпохі шасцідзясятніца, у атмасферы якой выспявала гуманістычнае светабачанне новага пакалення.

У 1964 годзе паэта прымаюць у Саюз пісьменнікаў Украіны. Гуцульскі легінь пераязджае ў сталічны Кіеў. Львоўская тутэйшасць, местачковыя патрыёты ўзбурыліся: «Як, Паўлычка, любоў і надзея ўсёй Галіччыны, робіцца кар'ерыстам і здраджвае свайму краю?». Аднак паэтычная інвектыва, філасофская прытча, мастацкае слова, вострае, як «меч гладыятара», сталі адэкватнай да гуцульскага тапірця зброяй паэта. Жыццядзейнасць Паўлычкі ў Кіеве адбываецца пад знакам непарыўнай барацьбы за цэласнасць дзяржавы Украіна. Думкі пра неабходнасць духоўнай спадкаемнасці ўсіх пакаленняў украінцаў — з усіх куткоў і мацерыковай Украіны, і эміграцыйных украінскіх — стымулююць энергію творцы.

Паўлычкавы ідэі незнішчальнасці ўкраінскай саборнай нацыянальнай культуры яскрава выяўляюцца ў яго зборніках «Гранослов» (1968), «Спіраль» (1984), «Поеми і притчі» (1988), «Покаянні псалми» (1994), «Вірші з майдану» (2014). Пад гэтым дэвізам Паўлычка ўдзельнічае ў стварэнні кінастужак «Сон» паводле Тараса Шаўчэнкі, «Захар Беркут» паводле Івана Франко. Такім выявіў сябе Паўлычка, працуючы ў сакратарыяце Саюза пісьменнікаў. І ў грамадска-палітычнай дзейнасці як дэпутат Вярхоўнай Рады, як ініцыятар Народнага Руху Украіны. І як дыпламат на пасадах Надзвычайнага і Паўнаважнага пасла Украіны ў Рэспубліцы Славакія, Рэспубліцы Польшча…

У межах гэтай віншавальнай публікацыі поўна ахарактарызаваць шматграннасць асобы знакамітага юбіляра немагчыма. Аднак пра яго літаратурную дзейнасць неабходна сказаць шырэй. Па колькасці выданняў ён — ці не найбольш актыўны ўкраінскі пісьменнік! Яшчэ першы зборнік «Любов і ненависть» (1953) прадказаў галоўную адметнасць таленту Паўлычкі: канфліктнасць лірычнага сюжэта і дыялектычнасць мыслення развіваюцца ім ва ўзаемадзеянні. Эстэтычная праграма паэта ўключае ў сябе культуру народнай этыкі, шырыню эмацыянальнага ўспрыняцця наваколля, прыгажосць чалавека паэт бачыць у бескарыслівай дабраце і душэўнай шчодрасці. Верш Паўлычкі ўнутрана арганізаваны. Працуючы ў многіх паэтычных жанрах і формах, асвоеных роднай літаратурай, паэтамі Захаду і Усходу, Паўлычка асаблівую ўвагу аддае санету. Аднак з-пад пяра Паўлычкі выходзяць і бліскучыя, арыгінальныя рубаі! Шлях паэта-грамадзяніна — гэта нястомныя пошукі праўды і чысціні ў творчасці і міжнародных адносінах, нацыянальным калектыве, асабістым жыцці індывідуума.

Вялікую папулярнасць прынесла Паўлычку яго інтымная лірыка: асобныя зборнікі «Таємниця твого обличчя» (1974, 1979), цыклы «Любов», «Пахощі хвої», «Пісні». Паэтычны Пегас Паўлычкі прынёс чытачам эратычную лірыку, створаную на ўзроўні класічных традыцый Сафо, Катула, Бадлера, Тувіма. Многія яго вершы праз меладычнасць, набліжанасць да фальклорнай паэтыкі «пайшлі ў народ», сталі любімымі і знанымі не толькі ва Украіне: «Два кольори», «Лелеченьки», «Впали роси на покоси»…

Як рэдактар знакамітага часопіса «Всесвіт» Паўлычка падключаў лепшыя ўкраінскія сілы да папулярызацыі сродкамі роднай мовы дасягненняў блізкіх і далёкіх культур, скіроўваў іх на раскрыццё ўкраінскай самабытнасці ў кантэксце «всесвіту». Пры гэтым Паўлычка няспынна пашыраў і свае творчыя арбіты: выступаў як крытык, літаратуразнаўца, перакладчык. Адзін толькі пералік перакладзеных ім аўтараў выклікае захапленне. Гэта творцы старажытнасці і сучаснасці, прадстаўнікі розных краін і народаў: Дантэ, Петрарка, Шэкспір, Гарсія Лорка, Хасэ Марці, Гётэ і Гейнэ, Рыльке і Ібсан, Стаф, Пушкін, Блок і Ясенін, Івашкевіч, Гвездаслаў, Незвал, Шымборская… Літаратуразнаўчы даробак Д. Паўлычкі вымяраецца тысячай старонак, ён выдадзены ў двух тамах. Першы — прысвечаны ўкраінскаму пісьменству, другі — творцам і творам сусветнай літаратуры.

Пачэснае месца ў творчым даробку і творчых планах Д. Паўлычкі займае беларусіка. Важкае слова сказаў Паўлычка пра В. Быкава, Р. Барадуліна, Н. Гілевіча, В. Рагойшу. Ён пераклаў творы М. Танка, А. Куляшова, П. Панчанкі, Г. Бураўкіна. А яшчэ — усе санеты Янкі Купалы. «Я верыў, — скажа Д. Паўлычка, — што ў Янкі Купалы павінна быць нешта такое, што мае адносіны да адвечнага жадання беларусаў — жадання мець сваю дзяржаву. Я пераэжыў пэўную радасць, перакладаючы надзвычайна актуальны яго санет «Наша гаспадарка»». Сёлетні чэрвеньскі нумар выдання «Новы час» змясціў выдатныя вершы Паўлычкі, прысвечаныя памяці Васіля Быкава.

Д. Паўлычка неаднойчы наведваў нашу краіну. Асабліва памятнымі былі яго прыезды ў Беларусь разам з шчырым украінскім беларусазнаўцам Р. Лубкіўскім у 2003 і 2009 гг., удзел у працы музеяў Янкі Купалы, Максіма Багдановіча. Беларусіку гэтых слаўных украінскіх сяброў вызначаюць словы Д. Паўлычкі: «Я не віддам своєї волі і вашу боронитиму сповна!»…

Магу запэўніць, што з часу яго львоўскай біяграфіі юбіляр вонкава амаль не змяніўся. Гады яго не «прызямлілі»: іскрысты погляд глыбокіх сініх вачэй, гучны эмацыянальны голас, парывістая хада. Ён энергічны, «стрункий, ще й на бороді ямка», як пяецца ў народнай песні. Адно толькі — у некалі густым чубе свавольна гаспадараць «вераснёўскія павуцінкі», непакорнае высокае чало прарэзалася барознамі маршчын. Унутрана ж, інтэлектуальна, духоўна, творча карпацкі легінь з году ў год узрастае, узбагачаецца на працягу ўсяго свайго няпростага, насычанага апантанай працай жыцця.

Дмытро Васільевіч Паўлычка — Герой Украіны, яго заслугі адзначаны высокімі дзяржаўнымі ордэнамі. Аднак найбольшая праўда адносна такіх людзей, як юбіляр, наступная: той, хто так мужна нясе свой цяжкі крыж, уганароўваецца цярновым вянцом…

Таццяна Кабржыцкая,
лэдзі ордэна Святой княгіні Вольгі

Санет

Калі памёр крывавы Тарквемада,
Пайшлі па ўсёй Іспаніі ганцы,
Даўгачаканай весткі пасланцы —
Манахаў хітрамудрыя армады.

О, як баяліся царквы айцы,
Што пахіснецца іхняя улада!
Душа ж ерэтыка той смерці рада,
Ды толькі усміхніся — і капцы!

Манахі самі ўсім распавядалі,
Што інквізітара ужо няма.
А людзі, слухаючы іх, рыдалі.

Няўжо пражыць мажліва без ярма?
І не ўсміхаліся, бо добра зналі:
Тыран падох, — але стаіць турма.

* * *

Ціха яблыкам даспелым
Ты упала ў ложа траў.
Маладое тваё цела
Я ад строяў вызваляў.

Паступова разняволіў
Я цябе з усіх тканін,
Разглядаючы паволі
Кучаравы востры клін.

На яго я наструніўся,
Райскі я адчуў матыў.
Я ўзляцеў, я нарадзіўся,
Нібы з кокана матыль.

О, як дзякаваў паклонна
Богу я ў той дзень святы,
Што свяціла тваё лона,
Нібы яблак залаты!

З цыклу «РУБАІ»

* * *

Ёсць людзі, як дубы, і ёсць дубы, як людзі,
Што пад маланкі падстаўляюць грудзі,
Каб кволую бярозку зберагчы,
Хоць знаюць добра: ім пагібель будзе.

* * *

Калі руку падымеш на Тараса,
Трымці, чакай такога абяртаса —
Цябе ўдарыць доля. І змяце,
Як пыл з твайго бліскучага абцаса.

* * *

О сэрца праўнука, адзнач
Тых, хто смяяліся скрозь плач.
А тым, што падалі ў блюзнерства,
Плявалі ў праўду — не прабач!


Пераклаў з украінскай Вячаслаў Рагойша

«Руш наперад!»

Напрыканцы лета пабачыў свет першы пасляюбілейны — 101 — нумар часопіса «Дзеяслоў».

Калі накрэсліць рэзюме да яго, то найперш, у адрозненне ад большасці папярэдніх, кідаецца ў вочы тэматычная стракатасць і шырокая аўтарская геаграфія. Як на мой погляд, гэта добра, асабліва апошняе.

Адкрываецца нумар нізкай вершаў **Валянціны Аксак** пад містычна-інтрыгуючым назвам «Меню таемнай вячэры». Гэта, па-простаму кажучы, збеларушчаныя (нацыяналізаваныя) хрысціянскія матывы. Своеасаблівы пошук святасці зямной грэшніцай. У верлібрах, «якія камусьці ўяўляюцца вер-



шамі», вібрыруе той унутраны душэўна-духоўны покліч, наўслед якому ідзе аўтар у сваіх мастацкіх пожадах і вымогах такога ачышчальнага шляху. І спадзяецца, што

Калі-небудзь
я зразумею тую,
што стаяла на гаўбцы
з келіхам чылійскага шыразу,
а цераз дзверы з кухні
йшоў дымок
ад спаленай намёртва
каляднае куцці.

Вядомы пісьменнік гістарычнай тэматыкі **Вітаўт Чаропка** друкуе кароткае апавяданне трансцэндэнтнага характару «Радасць руху», пра фізічнае і духоўнае пераадоленне трагічных і лёсавызначальных сітуацый у жыцці чалавека. І ўвогуле, ці заўсёды гэта магчыма? На тое ў аўтара ёсць, апроч уласнага досведу, такія высновы: *«Руш наперад, нават калі расчараванні сагнулі цябе і аднялі надзею. Руш наперад, крок за крокам, як анямелую нагу, цягні за сабой цяжар сваіх грахоў, як свой крыж іх нясі, не азірайся назад, руш наперад! Нават калі не дойдзеш да патрэбнай мэты, дык наблізішся да яе, затое іншы па тваіх слядах дойдзе да яе і будзе табе ўдзячны за пракладзеную сцяжыну. Руш наперад! Толькі рух дае адчуванне жыцця, толькі так спазнаеш радасць руху! Дык руш наперад, куды цябе вядзе твой вольны розум!»*

Уладзімір Някляеў прапануе чытачам *нальшанскую легенду* «Зорка Дзіва». Гэта яшчэ адна па-майстэрску выпісаная знаным паэтам гісторыя родавай (крэўна-крэўскай) сутнасці беларускай нацыі ў яе міфалагічным узнаўленні. Каханне і любоў, нараджэнне і смерць, гібель і ўваскрашэнне... Як і большасць такіх аб'ёмных паэтычных твораў гэтага аўтара, легенда напісана ў дэкламацыйным стылі, немалаважным для публічнага ўспрымання. Усё без швоў суцэльна знітавана: думка, рытміка і эмоцыя, дзе слова трымаецца за слова, як каханкі — адно за аднаго... З такіх палкіх міфа-метафарычных узаемааднасін і нараджаецца паэзія:

То пад ім яна стагнала,
То яна над ім
Зоркай бліскала і ззяла,
І кахала, абдымала
У агні сваім.
І да зоркі кожны дотык
Цела працінаў...
Ні раней ён і ні потым
Гэтак не кахаў.
Бог паслаў яму каханку!..
І прачнуўшыся наранку,
Сон на яве ўбачыў Янка
Той, які прысніў:
У агні стаяла Дзіва...
І ўсміхнуўся ён шчасліва,
І ў агонь ступіў.

Нечаканы па сваёй ідэі, змесце і форме празаічны тэкст прапануе пісьменнік **Васіль Гігевіч**. Называецца ён «Творчасць», з падзагалоўкам *«спроба аналізу»*. Чытач адразу ж настройваецца на літаратурна-крэатыўны лад, чакаючы неардынарных развагаў на заяўленую тэму. Аднак у нашым выпадку не ўсё так проста. Калі ў першай частцы аўтар і насамрэч задаецца спробай аналізу літаратурнай творчасці, то далей ён нечакана адыходзіць ад гэтага і пачынае абгрунтоўваць свае філасофскія і мысьлярскія тэзісы пра ўсё чалавечае жыццё, высноўваючы яго ад першапачатку Слова і першакрыніц быцця (тут — ад кастрычніцкай рэвалюцыі) да нашых дзён. Метад цікавы, але занадта ўжо хаатычны і разбэрсаны — ад праставата-наіўнай, падчас сентыментальнай спробы апісання працэсу і сутнасці самой літаратурнай творчасці да практычна-дакументальных сюжэтаў (мажлівасці і немагчымасці пры тых ці іншых умовах і раскладах зямнога жыцця ўвогуле)... Свой эсэістычна-публіцыстычны запал і набыты асветніцкі досвед В. Гігевіч у рэшце рэшт зводзіць да маральнасці і пошукаў бяспечнай чалавечай будучыні, якія, нібыта панацэю, прапісвае дзесяцццю рэцэптамі-запаветамі Новай рэлігіі, падкрэслена *«заснаванымі на разумнасці»*.

З вышыні ўласнага набытага жыццёвага і творчага вопыту прапануе чытачам сваю паэтычную нізку **Галіна Каржанеўская**. Вершы простыя, як «дарога да Бога», філасофія іх больш чым відавочная:

«Бывай» не гаварыце маладосці,
Пакуль да вас прыходзіць
Муза ў госці,
Пакуль між сном і явай, раніцою
Рэальнымі здаюцца планы, мроі...

Друкуецца заканчэнне факталагічнай аповесці пра Адама Станкевіча «...Усе бачылі нястачу віна...» **Леаніда Дранько-Майсюка** з кнігі «У Вільні і больш нідзе». Па сутнасці, гэта архіўна-біяграфічны нарыс з літаратурна-мастацкімі ўстаўкамі аўтара пра вядомага беларускага ксяндза і грамадскага нацыянальнага дзеяча і асветніка, замучанага і даведзенага да гібелі бальшавікамі ў Азярлагеры пад далёкім халодным Брацкам у1949 годзе. Зачапіў за жывое такі нечаканы пасаж у пасляслоўі: *«Яму заўсёды давяралі грошы, і ён ні разу нікога не падмануў, не ўтаіў ні капейкі... <...> Зрэшты, можна і не здзіўляцца, што быў такі — гадаваўся ж у сям'і, дзе шчыра шанавалі запавет: не крадзь! Грошы з ягоных рук без астачы йшлі на грамадскую справу, і калі справа ўдавалася, то ён мог тады і весела ўздыхнуць: «Эх, каб грошы ўмелі размаўляць і размаўлялі па-беларуску, то тады па-беларуску гаварылі б усе!»*. І напрыканцы аповесці аўтар піша: *«Душа Адама Станкевіча супакоена верай: Бог прамаўляе беларускай моваай таксама... Магчыма, у апошнюю сваю хвіліну святар адкрыў галоўнае: калі пытацца, то пытацца заўсёды варта пра адно — дзе ты, Беларусь? А магчыма, у тую хвіліну ўспомніў пра вяселле ў Кане Галілейскай, на якім Ісус Хрыстос ваду перажварыў у віно — зрабіў немагчымае. Тое ж немагчымае рабіў і ён, Адам Станкевіч, бо таксама ж бачыў нястачу віна, — брак Беларусі ў Беларусі, — і да апошняга (як мог і як умеў!) перапараўляў буднае — у святочнае. І аддаў жыццё, бо толькі жыццё — плата за высокую мэту!»*

Нізка вершаў віленчанкі **Ванды Марціншдуш Рэйш** «Плод авакада» — гэта, па ўсім, даніна любові і павагі партугальскай Мадэйры ў яе гожым беларускамоўным успрыманні. Прырода, культура народа, яго душа, пачуцці і філасофія духоўнага жыцця... Вершы і сама іх паэтыка зроблены ў мастакоўскім стылі — яны каляровыя, пахкія, эмацыянальна-чуйныя, візуальна-вабныя і прыцягальныя:

Хачу пад сэрца стук
Палаць, згараць датла,
Пакуль спявае лук,
Пакуль ляціць страла.

Шчымліва-горкія, а часам проста сентыментальныя і павучальныя гісторыі з пасляваеннага маленства — сіратлівага, галоднага і халоднага — прадстаўлены трыма кароткімі навеламі магіляўчаніна **Міхася Булавацкага**. Яны так і названы: «Згадкі маленства» («Лыска», «Шаптуха», «Яблынька»). Разважаючы над тэкстамі, нечакана прыйшло на розум неардынарнае параўнанне, што гэтыя тэксты могуць успрымацца сучаснымі маладымі чытачамі прыкладна так жа, як пяцьдзясят гадоў таму маім чытацкім пакаленнем — «Пяць лыжак заціркі» Змітрака Бядулі. Адным словам, нязмушаная, шчырая (сёння сказалі б «нонфікшн») проза *класічнай* беларускай правінцыі вартая ўвагі.

Вершы **Ганны Комар** — гэта аддаленыя, але не адстароненыя асацыяцыі, якія ўводзяць чытача ў тэкст сваёй нечаканай падвоенай метафорыкай, адлюстроўваючы яго сэнс і духоўна-інтэлектуальную сутнасць... Кажучы шчыра, вершы з ранейшых публікацый і кніг паэткі мне былі бліжэйшымі, больш празрыстымі, менш загадкавымі, але значна глыбейшымі ў сваіх ідэйных і мастацкіх праяўленнях.

А ў яе пад адзеннем
ад ключыц да шчыкалатак
словы, напісаныя
вострым прадметам,
нашкрабаныя наспех,
рэльефныя, для чытання
з заплюшчанымі вачыма.

Два аповеды **Паўла Касцюкевіча** пад агульным назовам «Мяне вучыў ангельскай Лі Харві Освальд» уяўляюць сабой аўтарскія фантазіі, заснаваныя на рэальных гісторыях, як палітычнага, так і сямейна-родавага характару. Натуральныя і ў той жа час выбітныя — мова, стыль, форма і сюжэты робяць тэксты займальнымі і чытэльнымі.

Будзённа-запозненая лірыка кахання, у тым ліку і віртуальна-мройлівая — у нізцы вершаў **Таццяны Барысюк.** Спрошчаная складанасць жыцця:

Апошні дзень вясны —
апошняе каханне.
Я мару зліцца з ім
у жарсным парыванні.
Ды толькі ці магчыма
шчаслівае здзяйсненне?
Анёлам за плячыма
ён, мройным вабным сненнем...
Не для мяне, о не!..

Вершы мастацтвазнаўцы — так можна сказаць, прачытаўшы паэтычную падборку лідчанкі **Кацярыны Янчэўскай** «Белае шмакроп'е».

Граматыка і сінтаксіс пачуццяў,
Задумкі для карцін сярод галін,
Узнёсласць колеру ў смарагдавым
ландшафце.

Аднак за ўсімі яркімі і вабнымі фарбамі прыхаваны няпросты ўнутраны дух жыцця:

Стары калодзеж
чыстай вады
абдымае
крыніцу пяшчоты.
Журботу маўчання майго —
паглыні!
Перамяні на мову!

Вядомы іраніст, парадыст і сатырык з Віцебска **Міхась Міранович** публікуе заканчэнне выбраных і перакладзеных ім на беларускую мову «Непрычасаных думак» **Станіслава Ежы Леца.** Вось адна з найбольш прыкольных: *«Плагіятары могуць спаць спакойна. Муза — жанчына, яна наўрад ці скажа, хто ў яе быў першым»*.

А **Вольга Гапеева** друкуе ў сваіх перакладах вершы індыйскага паэта **Мохана Рана,** які ўжо даўно жыве ў Вялікабрытаніі, але піша на мове хіндзі (хоць пазначана, што пераклады В. Гапеевай зроблены з ангельскай мовы). Як піша сам індыйскі паэт: *«на твары маім маска, адмыслова прыдуманая для гэтага верша»*.

Да 60-годдзя выдатнага (заўчасна памерлага: 1959–2005) паэта Анатоля Сыса крытык і літаратуразнаўца **Сяргей Кавалёў**, які жыве ў Любліне, узгадвае таленавітага творцу праз прызму шматзначных сведчанняў яго былых таварышаў, сяброў і калегаў, а таксама архіўных даведак і розных публікацый у друку. Ёсць пэўная спроба аналізу жыцця і творчасці выбітнай асобы як паэта і чалавека. Аўтар як бы папярэджвае нас, што мажліва *«не ўсе літаратуразнаўцы ды і звыклыя чытачы будуць згодныя з такой высокай ацэнкай творчасці Анатоля Сыса, з сакралізацыяй яго неадназначнай асобы і «запісваннем» нашага сучасніка ў пантэон нацыянальных класікаў узроўню Купалы і Багдановіча, прыніжаючы тым самым статус Якуба Коласа, Уладзіміра Дубоўкі, Уладзіміра Жылкі, Максіма Танка, Ларысы Геніюш, Уладзіміра Караткевіча і іншых выдатных беларускіх паэтаў XX ст. Бясспрэчна аднак, што Анатоль Сыс назаўсёды застанецца ў гісторыі беларускай літаратуры як выдатны паэт канца XX ст., творчы лідэр свайго пакалення, голас нацыянальнага адраджэння ў Беларусі, пісьменнік з нетыповай біяграфіяй і трагічным лёсам»*.

Сёння пісьменнік і філасаф **Валянцін Акудовіч** як бы абвяргае свой даўні, але вельмі жывучы сафізм з усім вядомым выразам *«мяне няма»* і ўпарта даводзіць сучаснаму чытачу, што ён быў, ёсць і будзе ў нашым нацыянальным адраджэнскім працэсе, культуры і літаратуры. У публікацыі "Крыніца" і "Крыніца" *(з хронікі беларускага інтэлектуала)* ён піша пра нашумелы ў свой час *элітарны* часопіс — пэўней, пра тое, як ён сам бачыць і разумее з сённяшняга пункту погляду гэты літаратурна-культуралагічны і ў нейкай меры філасофскі праект постсавецкага часу, — яго быццё і кананне...

Лявон Юрэвіч з Нью-Ёрка піша пра пошукі першакрыніц, якімі, мажліва, карыстаўся У. Караткевіч падчас працы над легендай «Ладдзя Роспачы».

Публіцыстка **Марыя Міцкевіч** публікуе артыкул пра братоў Луцкевічаў і іх грамадска-палітычную і літаратурную сувязь з Якубам Коласам, пра неацэнную значнасць іх асветніцкай працы ў справе адраджэння нацыянальнай нівы жыцця беларускага народа.

Паэт **Васіль Жуковіч** у сваім эсэ цёпла ўспамінае чысты і годны талент паэта і рэдактара Алеся Пісьмянкова.

Уладзімір Сіўчыкаў прапануе чытацкай увазе штрыхі да творчага партрэта вядомага скульптара Уладзіміра Слабодчыкава.

Літаратуразнаўца **Алена Лепішава** піша пра эксперыментальную драматургію канца XX — пачатку XXI стагоддзяў («Пакаленне "нетутэйшых"»).

Вольга Гапеева прэзентуе антыраман «не для ўсіх» «Калі прыгледзецца — Марс сіні» Зм. Вішнёва: як аўтарскую шчырасць адносна трагізму авангарда.

Леанід Галубовіч рэцэнзуе зборнік хоку Уладзіміра Сцяпана «Шапка».

Традыцыйная рубрыка «Дзеяпіс» з анатацыямі новых кніжных навінак завяршае публікацыі нумара.

Усім прыхільнікам беларускай літаратуры жадаю зацікаўленнага чытання.

ЛеГал

На якія сродкі жывуць брытанскія пісьменнікі?

Каралеўскае літаратурнае таварыства (Royal Society of Literature) у Вялікабрытаніі правяло даследаванне сярод пісьменнікаў, падчас якога высветлілася, на якія сродкі яны жывуць.

Аказалася, што больш чым дзве трацін прафесійных аўтараў у краіне ў мінулым годзе атрымалі па 10 тысяч фунтаў стэрлінгаў даходу.


Каралеўскае літаратурнае таварыства апытала 2,2 тысячы аўтараў. 67% літаратараў у мінулым годзе атрымалі менш, чым £ 10 тысяч даходу (30 тысяч беларускіх рублёў). І гэта ў той час, калі сярэдні гадавы даход брытанца, па дадзеных афіцыйнай статыстыкі, роўны амаль £ 28 тысяч.

Даследаванне паказала, што амаль утрая хутчэй літаратар зможа зарабляць £ 30 тысяч у год ці больш іншым заняткам. Аднак аўтараў, якія маюць такі прыбытак непасрэдна ад сваёй творчасці, атрымалася ўсяго 5%, а вось тых, хто можа столькі зарабляць паралельнай працай – 14%.

Вядома, што для паўнавартаснай творчасці неабходна не толькі натхненне і талент, але мноства іншых фактараў. На думку апытаных аўтараў, самай неабходнай падтрымкай падчас літаратурнай працы з'яўляецца адзінота, якую ім могуць даць блізкія. Яе назвалі 80% рэспандэнтаў. Таксама вельмі важная эмацыйная падтрымка, якую згадалі 60% апытаных, і амаль такая ж колькасць — 58% — літаратараў мае патрэбу ў фінансавай падтрымцы.

Самымі распаўсюджанымі цяжкасцямі, з якімі сутыкаюцца пачаткоўцы, былі названы недахоп грашовых сродкаў (68%) і часу (67%). Крыху больш за палову (54%) апытаных аўтараў адзначылі недастатковую ўпэўненасць у сваіх сілах.

Датычна геаграфіі паспяховых ангельскіх пісьменнікаў: дзве трацін з тых, хто зарабляе больш за £ 30 тысяч штогод, жывуць у Лондане альбо на поўдні Туманнага Альбіёна.



«Гары Потэр» за... 34,5 тысячаў даляраў

Асобнік першага выдання кнігі Джоан Роўлінг «Гары Потэр і філасофскі камень» «пайшоў з малатка» за 34,5 тысяч даляраў ЗША...

Пра гэта паведаміў тэлеканал CNN. Таргі праводзіліся аўкцыённым домам «Hansons».

Адметна, што прададзенае выданне мае дзве рэдакцыйныя памылкі, а пры першасным продажы ў 1997 годзе кошт кнігі быў усяго 1,20$.

Кніга ляжала ў шафе каля 20 гадоў, пасля чаго яе ўладальніца вырашыла сабраць грашовыя сродкі для рамонту кватэры. Яна запрасіла спецыяліста, які ацаніў тры скрынкі з кнігамі, сярод якіх было і першае выданне «Гары Потэра».

Мішэль Абама і Нобелеўская прэмія?


Упачатку гэтага месяца ў некаторых амерыканскіх выданнях было абвешчана, што былая першая лэдзі Злучаных Штатаў Мішэль Абама стане лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры.

У прыватнасці, 4 верасня на сайце «Taters Gonna Tate» быў апублікаваны артыкул пра тое, што былая першая лэдзі Мішэль Абама будзе абвешчаная лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры. Яе муж, былы прэзідэнт Злучаных Штатаў Барак Абама, быў ганараваны Нобелеўскай прэміяй міру ў 2009 годзе.

У паведамленні гаворыцца: «Падобна, што камітэт Нобелеўскай прэміі неабыякавы да Абамы... Былая першая лэдзі далучыцца да свайго мужа Барака Абамы ў якасці ўладальніцы прэстыжнай прэміі»...

Невядомыя творы Марсэля Пруста

Прыхільнікі Марсэля Пруста атрымаюць яго новую кнігу твораў — амаль праз 100 гадоў пасля смерці французскага пісьменніка.



Французскае выдавецтва «de Fallois» абвясціла, што гэтай восенню з'явяцца дзевяць раней не выдадзеных навэл і апавяданняў літаратурнага майстра і аўтара эпічнага сямітомнага рамана «У пошуках страчанага часу», якія адносяцца да ранняй творчасці вядомага пісьменніка.

Як паведаміла Agence France Presse, Пруст меў намер уключыць іх у сваю першую кнігу — зборнік вершаў у прозе і навэл, які быў упершыню апублікаваны ў 1896 годзе, аднак пры падрыхтоўцы выдання ён з невядомай прычыны зняў тыя 9 твораў.

Рукапісы адшукаў заснавальнік выдавецтва Бернар дэ Фаллуа, які памёр у канцы мінулага года. Іх выдадуць пад агульнай назвай «Таямнічы карэспандэнт ды іншыя нявыдадзеныя навэлы». Кніга на 180 старонак будзе апублікавана 9 кастрычніка і ўключацьме факсіміле рукапісаў Пруста.

Тэксты, паводле выказвання рэдактараў выдавецтва, «маюць намёкі на будучы стыль Пруста, у тым ліку і дзіўныя метафары, дзіўныя камедыйныя ідэі».

Гэта не адзіны рукапіс Пруста, знойдзены Бернарам дэ Фаллуа, адным з вядучых экспертаў па творчасці Пруста. Разам з Андрэ Маруа ён выявіў, а потым ідэнтыфікаваў і падрыхтаваў да выдання 900-старонкавы раман «Жан Санта», напісаны Прустам у 1896–1899 гадах і пакінуты пры жыцці пісьменніка неапублікаваным. Сярод літаратуразнаўцаў да гэтага часу няма адзінага меркавання, у якім парадку павінны чытацца часткі рамана. Выданні 1952 і 1971 гадоў адрозніваюцца адзін ад аднаго.

«Даўлатаўскі чарачны ход»

У Пецярбургу ў гонар дня памяці вядомага пісьменніка і журналіста Сяргея Даўлатава, у так званы «Дзень Д-89» (творца нарадзіўся 3 верасня), зладзілі «чарачны ход».



Фестываль Даўлатава і яго часу «Дзень Д-89» адбыўся ўжо ў трэці раз і быў прысвечаны 30-гадоваму юбілею вяртання пісьменніка на радзіму (дзякуючы з'яўленню яго твораў у СССР). «Ідэолагам» літаратурнага свята стаў пісьменнік Леў Лур'е.

У праграме было звыш 40 падзей: канцэрты, лекцыі, кінапаказы, майстар-класы, экскурсіі, выставы і вулічнае свята.

На выхадныя бары, кафэ, закусачныя і рэстараны Піцера ўвялі ў меню спецыяльны кактэйль «Сярожа». Арганізатары мерапрыемства распавялі: «Паколькі акцыя "Даўлатаўскі чарачны ход" праводзілася ў межах фестывалю, у дні свята гэтыя напоі налівалі ўсяго за 100 рублёў (расійскіх) любому, хто сказаў кодавую фразу "Я п'ю за Даўлатава!". У акцыі прынялі ўдзел больш за 10 «піцейных». Акрамя гэтага, напярэдадні «Дня Д» у некаторых барах і рэстаранах з'явілася асобнае "Даўлатаўскае меню"».

Джоан Роўлінг-фундатар

Сусветна вядомая брытанская пісьменніца Джоан Роўлінг, аўтар кніг пра Гары Потэра, зрабіла ахвяраванне для даследаванняў лячэння рассеянага склерозу ў цэнтры, названым у гонар яе памерлай маці — Эн Роўлінг.

Ахвяраванне ў памеры 18,8 мільёна даляраў (15,3 мільёна фунтаў стэрлінгаў) будзе выкарыстана для будаўніцтва новых аб'ектаў у даследчым цэнтры, размешчаным у Эдынбургскім універсітэце ў Шатландыі. Маці папулярнай пісьменніцы пакутавала ад гэтай хваробы і памерла ва ўзросце 45 гадоў.

Яшчэ адно ахвяраванне ў памеры 15,4 мільёна даляраў Роўлінг зрабіла ў 2010 годзе, адкрыўшы Клініку рэгенератыўнай неўралогіі Эн Роўлінг ва ўніверсітэце.

Напісаны больш за 20 гадоў таму маці-адзіночкай кнігі пра Гары Потэра і яго сяброў у Хогвартсе, якія спачатку ні адно вялікае выдавецтва не бралася друкаваць, сталі сусветнай сенсацыяй. З таго часу апроч асноўных сямі кніг патэрыяны былі выпушчаны кінакарціны і кнігі, пастаўленыя тэатральныя спектаклі, адкрыліся паркі забаў і выставы. Паводле інфармацыі LA Times са спасылкай на дадзеныя CBSNews, 9 гадоў таму сумарныя актывы Джоан Роўлінг ацэньваліся ў 1 мільярд даляраў.

Польшча і электронныя кнігі

Варшаўскае зніжэнне падаткаў на лічбавыя кнігі пачне дзейнічаць з 1 лістапада і стане доўгачаканым выроўніваннем падаткаабкладання, якое дазволена Брусэлем для папяровых і электронных кніг.

Паводле гэтага закона, які падпісаў прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда, электронныя кнігі будуць абкладацца падаткам у 5%, што з'яўляецца істотным зніжэннем з цяперашняй стаўкі ў 23%. На кнігі на дысках, касетах і іншых носьбітах таксама распаўсюджваецца 5%-ная стаўка.

Ева Шміт-Белкарц, прэзідэнт праўлення «Empik», найбуйнейшай у Польшчы сеткі кнігагандляроў, адзначыла, што гэтая падзея будзе вітацца як чытачамі, так і выдаўцамі: «Гэта крок наперад у дачыненні да апрацоўкі абодвух фарматаў кніг, паколькі яны адчувалі дыскрымінацыю з-за больш высокай стаўкі падаткаў. Стары курс, безумоўна, не быў прымальны для выдаўцоў, бо ён рабіў публікацыю электронных кніг менш выгаднай».

Шміт-Белкарц распавяла, што ў «Empik» папулярнасць электронных кніг расце сярод спажыўцоў, прычым продаж павялічваецца на 11-19% у год.

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы novostiliteratury.ru, CNN, «Афиша Daily», «The Associated Press», «Taters Gonna Tate» і telegraf.com.ua.

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by